ПРАЛЕТАРЫ УСІХ КРАЮ, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

ЗЬВЯЗДА

Орган ЦК і Менскага гаркому Кампартыі (б) Беларусі.

МЕНСК, Савецкая 63

...а сацыялізму. В. СА... ...ЛЬ НОВЫЯ МАСЫ ТАВАРАЎ ШЫРОКАГА СПАЖЫВАНЬ... ...ЛЬ. (2 стар.).

...ЛЬ. (2 стар.).

...ЛЬ. (3 стар.).

У К ПЛЕНУМ ЦК ЛКСМБ. Калгаснай пісьмы камсамолу — канкретнае ...ЛЬ. (3 стар.).

...перамогі на фронце ўборчай замацаваць посьпехі трэцяй бальшавіцкай сяўбы (1 стар.).

ЗА МЯЖОЙ.

Высока ўзьняць масавую работу на вёсцы. На аснове поўнай добраахвотнасьці дабіцца рашаючых посьпехаў у падпісной кампаніі (1 стар.).

Зьлёт «Стшэльца» ў Вільні (4 стар.).

Арышт камуністычнага кандыдата ў прэзыдэнты тав. Фостэра 4 стар.).

Рашаючая перамога сацыялізму

Сёньняшняя зводка НКЗБ аб выніках веснавой сяўбы выразна сьведчыць аб канчатковых перамогах сацыялістычнага шляху разьвіцьця сельскай гаспадаркі. Вясна паказала, што за апошні год на вёсцы адбыліся новыя карэнныя сацыяльныя зрухі ў бок умацаваньня пазыцый сацыялізму, у бок ператварэньня БССР з краіны самых дробных аднаасобных гаспадарак у краіну буйной сельскай гаспадаркі.

Па БССР па 25 чэрвеня засеяна 2.543 тыс. га яравых, па 216 тыс. га больш, чым у мінулым годзе. Саюзны плян выкананы на 96 проц. Саўгасы засеялі 168 тыс. га, па 65 тыс. га больш 1931 году. МТС засеялі 485 тыс. га, у той час, як летась было засеяна толькі 212 тыс. га. Тэхнічных культур засеяна 299 тыс. га, на 30 тыс. га больш мінулага году. Факты паказваюць, як БССР няўхільна ідзе па шляху спэцыялізацыі, па шляху ператварэньня з краіны спажывецкай у краіну вытвараючую, у краіну буйной сацыялістычнай таварнай гаспадаркі.

Пад кіраўніцтвам ЦК УсеКП(б) на чале з тав. Сталіным, няўхільна ажыцьцяўляючы генэральную лінію партыі, БССР разам з братэрскімі рэспублікамі Савецкага саюзу дабілася новых рашаючых перамог у сацыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі. У выніку веснавой сяўбы Савецкі саюз канчаткова ўмацаваўся на сацыялістычным шляху. Рашучую перамогу сацыялізму можна лічыць завершанай.

Працоўнае сялянства БССР, яго пераважная маса — серадняцтва, пад кіраўніцтвам КП(б)Б, па прыкладзе асноўных збожжавых раёнаў СССР, стала канчаткова, цьвёрда і беспаваротна на сацыялістычны шлях, на шлях аб'яднаньня ў калгасы. Канчаткова разьбіта стаўка Прышчэпавых і К-° з нацдэмаўскага лягеру на рэстаўрацыю капіталізму, на хутарызацыю БССР. Лепшым сьведкай гэтаму посьпехі трэцяй бальшавіцкай вясны.

Напярэдадні веснавой пасеўнай кампаніі кулацтва імкнулася сарваць пад рыхтоўчую работу да сяўбы, ужывала ўсе формы і мэтады, нават адкрытыя вылазкі для таго, каб разбурыць калгасы з сярэдзіны. Калгасныя масы, беднякі і сераднякі — аднаасобнікі, пад кіраўніцтвам партарганізацыі нанесьлі жорсткі бязьлітасны адпор кулаку. На вылазкі клясавага ворага ўзорнай перадавы калгасаў адказалі ўзорнай работай на палёх, ударнымі тэмпамі па выкананьні і перавыкананьні пасеўных плянаў.

Ушчэнт разьбіты разважаньні кулацкай агентуры, правых і каля правых апартуністаў аб перэльнасьці пасеўных плянаў, не апраўдаліся іх прадраканьні аб зрыве веснавой сяўбы. КП(б)Б з усёй бальшавіцкай рашучасьцю біла па «леваках», трацкістуючых элемэнтах, якія імкнуліся пераскочыць праз непрайдзены этап.

Веснавая сяўба як па Савецкім саюзе, так і па БССР з посьпехам прайшла таму, што ЦК УсеКП(б) пастановамі аб збожжа, мясазагатоўках і разгортваньні калгаснага гандлю стварылі вялізарны стымул для барацьбы за высокі ўраджай, за дадатковае атрыманьне сельска-гаспадарчай таварнай прадукцыі.

Веснавая сяўба па БССР з посьпехам прайшла яшчэ і таму, што **Цэнтральны Камітэт КП(б)Б, на чале з першым сакратаром тав. Гікало,** ужыў усе захады да **перабудовы работы па-новаму,** пачынаючы ад цэнтральных установаў і канчаючы пізавымі зьвеньнямі партыйных арганізацый. **Апэрацыйнасьць у кіраўніцтве,** канкрэтнасьць у рабоце, яснасьць у пастаўленых задачах, **сувязь з масамі, узначальваньне мас,** мабілізацыя іх увагі на асноўных лёзунгах, асноўных зьвеньнях, **падцягваньне адстаючых вучасткаў—вось бальшавіцкі стыль работы.**

Цэнтральны Камітэт, мабілізуючы членаў ЦК, адказных работнікаў цэнтральных установаў, пасылаючы іх па месцы — у МТС, калгасы, саўгасы, паселішчы, туды, дзе непасрэдна вырашаліся посьпехі сяўбы, сваячасова выпраўляў памылкі, якія дапускаліся паасобнымі партарганізацыямі, рашуча змагаўся з «лівацкай» недаацэнкай аднаасобнага сэктару. Толькі пры такіх умовах работы можна было дасягнуць бальшавіцкіх тэмпаў, выканаць саюзны плян на сяўбе на 96 проц.

У тэмпах сяўбы, як у люстры, адбіваліся тэмпы работы ўсёй КП(б)Б, тэмпы работы кожнай партарганізацыі. Першыя чатыры пяцідзеўкі мая давалі зусім нязначны прырост. На 20 мая пасеўны плян быў выкананы усяго толькі на 18,3 проц. ЦК прымушан быў падкрэсьліць у сваёй пастанове ад 27 мая адсутнасьць бальшавіцкай барацьбы, неўсьвядомленасьць усёй важнасьці работы па сваячасовым выкананьні плянаў трэцяй бальшавіцкай вясны з боку парткіраўніцтва 17-ці раёнаў БССР. ЦК вымушан быў за рэзкае адставаньне ў сяўбе абвініць рэчыцкае парткіраўніцтва. Рад раёнаў, у тым ліку і раёны буйных пралетарскіх цэнтраў — Менск, Гомель, Віцебск — былі занесены «Зьвяздой» на чорную дошку.

Меры, ужытыя Цэнтральным камітэтам па мабілізацыі ўсёй КП(б)Б, усёй пралетарскай грамадзкасьці на ліквідацыю прарываў у сяўбе далі свае поўныя вынікі. Ужо ў пятай пяцідзеўцы мая месяца мы мелі прырост засеянай плошчы на 14,2 проц., у шостай пяцідзеўцы — на 20,4 проц. (рэкордная лічба прыросту). Рад раёнаў, якія адставалі, па-бальшавіцку мабілізаваўшы масы, зьнялі з сябе генебную пляму чорнай дошкі.

Аднак, цяжка было на першых парах некаторым як цэнтральным, так і раённым арганізацыям перабудоўваць сваю работу. Цяжка было вытручваць закасьцяненьне, абломаўшчыну, кіраўніцтва «наогул», прывучыць кожнага работніка перайсьці ад трасктні да жывой будзённай крапатлівай работы па сацыялістычнай будоўлі, да рэагаваньня на кожную «дробязь» калгаснага будаўніцтва. Але ня ўсё яшчэ зроблена ў перабудове работы па-новаму. Яшчэ большае трэба будзе зрабіць.

Сьведкай таму зьяўляюцца **Нараўлянскі, Смалявіцкі, Чачэрскі, Веткаўскі, Прапойскі** і інш. раёны, якія **ня зышлі з чорнай дошкі,** акрамя таго 14 раёнаў, якія выканалі пасеўны плян ня больш чым на 85 проц. Парткіраўніцтва гэтых раёнаў, неадкладна перабудаваўшы работу, павінна будзе нагнаць недасеў за лік лепшага добраякаснага правядзеньня ўборчай кампаніі.

Той факт, што Наркамзем, Калгасцэнтр, Трактарацэнтр, большасьць саўгастрэстаў пасьля сканчэньня пасеўнай кампаніі сваячасова не пераключылі ліся на падрыхтоўку да ўборчай кампаніі, што яны на сёньняшні дзень паваг ня маюць пішкага ўяўленьня аб ходзе поліва, касьбы, рамонту машын, — па казвае на адсутнасьць апэрацыйнасьці ў падрыхтоўцы да ўборкі.

На БССР на першае месца па сяўбе вышлі машына-трактарныя станцыі. Яны выканалі свой плян на 99,9 проц. Пры дапамозе пралетарскай грамадзкасьці, пры дапамозе ленінскага камсамолу, пераважная частка МТС па ас нове арганізацыйна - гаспадарчага ўмацаваньня калгасаў, ажыцьцяўляючы 6 умоў тав. Сталіна, па-бальшавіцку змагалася за тэмпы, за якасьць, за высокі ўраджай трэцяй бальшавіцкай вясны.

Зусім адваротнае мы маем з саўгасамі. У той час, калі саўгасы па Савецкім саюзе стаяць на першым месцы пасеўнай, дык саўгасы БССР увесь час цягнуліся ў хвасьце, ганебна адсталі, недавыканалі плян на 15,1%. Прычыны ганебнага адставаньня хавацца ў тым, што дырэкцыі саўгастрэстаў, паасобных саўгасаў не паклалі ў аснову сваёй работы практычнае ажыцьцяўленьне 6 умоў т. Сталіна.

КП(б)Б стаіць напярэдадні ўборачнайкампаніі. Прычым нельга забываць, што **іменна зараз вырашаюцца посьпехі ўборачнай. Ад папярэдняй падрыхтоўкі будуць залежаць тэмпы і якасьць работы ў часе ўборкі.**

Раённыя партарганізацыі не павінны чакаць «гарачай пары». МТС, калгасам і саўгасам трэба захаваць суровую плянавасьць, адначасовае выкананьне ўсіх сельска - гаспадарчых работ: поліва, сенаўборку, ворыва папару, падрыхтоўку да ўборкі збожжа і інш.

Для гэтага патрэбна загадзя правільна расставіць рабочую сілу ў брыгадах. Не дапускаць цякучасьці, работы «скопам», пераходу калгасьнікаў з аднэй брыгады ў другую. За кожнай групай, зьвяном замацаваць адпаведныя сродкі вытворчасьці, машыны, коні і с. г. інвэнтар.

У калгаснай брыгадзе будуць вырашацца посьпехі ўборачнай. Ад ініцыятывы брыгадзіра залежыць пасьпяховая ўборка і рамонт інвэнтару, транспарту і збруі. **Максымум увагі пастаяннай вытворчай брыгадзе, больш практычнай работы па яе ўмацаваньні.**

Правільна расставіўшы сілы, мабілізаваўшы масы, паладзіўшы на прыкладзе пасеўнай апэрацыйнае кіраўніцтва, КП(б)Б зможа па-баявому правесьці ўборачную кампанію бяз усякіх страт.

Перамогай на фронце ўборачнай замацаваць посьпехі трэцяй бальшавіцкай сяўбы

Парушаны спакой дырэктароў

У гарачы чэрвеньскі дзень безьмяцежны настрой дырэктара Садагародтрэсту тав. **Самохіна** быў раптам парушэн паданай яму тэлеграмай.

Самохіну за апошні час хочацца крыху адпачыць, забыць пра гароды, пра поліва, пра сенаўборку. І раптам вось табе.

Самохін два разы ўважліва прачытаў тэкст тэлеграмы, у якой гаварылася:

«Да касьбы не прыступіў, чакаю дажджоў».

Вось што паведамляў малады дырэктар з гароднага саўгасу **«Чырвоны гарадок».** У гэты момант Самохін паспачуваў свайму малодшаму субрату. Ён у апошнія дні таксама знаходзіцца ў стане «чаканьня дажджоў».

Але тэлеграма як дакучлівая муха зноў напомніла т. Самохіну, што гароды пачынаюць зарастаць пустазеллем, а травы перасьпяваць. Гаспадаркі забясьпечаны рабочай сілай толькі на 50 проц. Пра недахват рабочых Самохін ведаў даўно. Але што было зроблена, каб забясьпечыць уборку ўраджаю бяз страт.

На гэта ва ўпор пастаўленае пытаньне на пасяджэньні калегіі Наркамзему БССР, прысьвечаным падрыхтоўцы да ўборачнай, ходу поліва і сенаўборкі, Самохін так і ня даў адказу. Праўда, ён дадаў, што саўгасы нерэгулярна шлюць весткі, што граблі адрамантаваны толькі на 37 проц. Колькі трэба рабочых для ўборкі азімых, ён ня ведае. Статыстыка ня склала балянсу патрэбнай рабочай сілы.

«Дажджоў чакаюць»... ня толькі дырэктар саўгасу «Чырвоны гарадок» і яго непасрэдны кіраўнік дырэктар Садгародтрэсту тав. Самохін.

Два тыдні таму назад намесьнік дырэктара Малакапрамтрэсту тав. **Кржэсінскі** на нарадзе, скліканай «Зьвяздой» і ЦКК-РСІ, заявіў, што для ўборкі сенажацяй у саўгасах не хапае 17.000 рабочых, што грамадзкае харчаваньне зусім не наладжана.

І зараз праз два тыдні т. Кржэсінскі манатонна, расьцягваючы, чытае, як завучаны псалтыр:

Для ўборкі сенажацяй не хапае 17.698 рабочых, завербавана 519, сенажацяй натуральных скошана... 0,25, канюшыны — 3,77.

Саўгасы імя Молатава, «Перамога сацыялізму» і «Дзярнавічы», дзе десяткі тысяч гэкт. высокай сакавітай травы чакаюць касцоў, зусім не пачышалі ўборкі.

— Тав. **Кандраль, вам** слова.

Кандраль, дырэктар ільнатрэсту, маўчыць. Замест дырэктара аграном т. Пракоф'ева бездапаможна водзіць пальцам па разграфленым аркушы паперы і зачытвае:

«Для поліва ільну не хапае 15.000 чалавека-дзён. Прапалата толькі 43 га. 1 ліпеня зьбіраем дырэктароў саўгасаў, даведаемся, як ідзе поліва, дамо дырэктывы».

Што дадаў да гэтага кіраўнік трэсту тав. Кандраль. Ён сядзеў і мэўчкі слухаў. Пад графамі з лічбамі аб недахваце рабочай сілы, ходзе рамонту, якія трэст шле ў Наркамзем, красуецца і яго подпіс. Відавочна, т. Кандраль належыць да тэй катэгорыі дырэктароў, якія лічаць... «Што кіраваць— гэта значыць падпісваць паперы».

Замест яго сказаў інспэктар Наркамзему.

У ільнатрэсьце кіраўнікі і спэцыялісты ня ведаюць сваіх саўгасаў. Ня ведаюць сапраўднага становішча спраў на месцы. Для барацьбы са шкоднікамі расьлін у ільнатрэсьце ёсьць толькі адзін выпрабаваны сродак— гэта плякаты. Іх разаслалі ва ўсе саўгасы. Да гэтага зводзіцца ўсё кіраўніцтва барацьбой са шкоднікамі.

—З завозам складаных уборачных машын у гэтым годзе — гаворыць прадстаўнік Белсельснабу — справа стаіць туга. Прамысловасьць недавыкоўвае заказы. Але косамі і сярпамі БССР зябясьпечана лепш за іншыя рэспублікі. Завезена 260.000 кос і 50.000 сярпоў.

Косы амаль цалкам распраданы. Горш з сярпамі. Іх неахвотна бяруць. Аказваецца, завезьлі сярпы меншага разьмеру. У радзе раёнаў шашы калгасьнікі ахрысьцілі іх «дзіцячымі сярпамі» і адмаўляюцца брацьб.

Серп, якім жнуць у нас у Беларусі, можа зрабіць нават звычайны саматужнік. Тым больш выраб такіх сярпоў пад сілу нашым мэталюргічным гігантам, як завод **імя Варашылава, «Камунар», Гомсельмаш.** Гэта з посьпехам зараз могуць выраблядь уцільцэхі, якія арганізуюцца на радзе прад прыемстваў. Але Белсельснаб ня ўлічыў гэтых магчымасьцяй.

Няма патрэбы пералічваць выступленьні ўсіх іншых прадстаўнікоў цэнтральных зямельна - калгасных арганізацый. Можна толькі дадаць, што аддзяленьню Трактарацэнтру аб ходзе поліва ільну нічога невядома.

Адно ясна, у цэнтральных - зямельна - калгасных арганізацыях, у тым ліку і ў апараце НКЗБ пасьля сяўбы наглядаецца халадок, імкненьне адпачыць. Сям-там спэцыялісты зьбіраюцца пайсьці ў адпачынак. У трэстах і ў калгасных цэнтрах зусім няма ніякага апэрацыйнага ўліку аб ходзе падрыхтоўкі да ўборкі, ходзе поліва і касьбы. Там, дзе няма ўліку, ня можа быць і апэрацыйнага кіраўніцтва.

Няма яго ня толькі ў трэстах, але і ў цэнтральным зямельным штабе— Наркамземе. З-га ліпеня — апошні тэрмін для ўборкі сенажацяй у паўднёвых раёнах. Засталося тры дні, але **Наркамзем ня ведае, як ідзе сенаўборка** ні ў адным з гэтых раёнаў. Далейшыя камэнтары непатрэбны.

ЗОРЫН.

ЗВОДКА НКЗБ

аб папярэдніх выніках сяўбы яравых культур па раёнах БССР на 25-VI-1932 г.

№№ п. п.	Назва раёнаў	Засеяна ўсяго яравых (у проц.)	У тым ліку: Збожжавых.	Ільну.	Канапель.	Бульбы.	Кормаплодаў і сілакоп. культур	Траў.
	ІЛЬНАМАЛОЧНЫЯ РАЁНЫ							
1.	Бяльніцкі	100,2	112,3	93,1	71,6	96,0	43,3	34,6
2.	Мсьціслаўскі	100,8	100,8	90,6	71,9	131,9	58,2	31,4
3.	Лёзьнянскі	98,6	104,2	95,7	—	100,8	88,6	36,5
4.	Горацкі	94,6	108,7	81,0	58,0	103,1	44,3	30,0
5.	Расонскі	93,8	103,2	95,9	—	99,9	45,4	15,0
6.	Бешанковіцкі	92,5	104,3	77,7	—	89,6	90,0	35,0
7.	Полацкі	92,0	105,7	85,8	—	98,2	56,5	32,9
8.	Лепельскі	92,0	104,9	87,0	69,3	101,1	45,6	10,9
9.	Сіроцінскі	92,0	105,7	89,6	—	90,4	40,2	15,0
10.	Шклоўскі	91,6	109,3	74,7	87,9	97,0	69,1	35,1
11.	Сураскі	90,4	113,6	85,4	—	80,2	81,3	18,8
12.	Вушацкі	90,0	102,9	75,7	—	106,4	34,6	19,3
13.	Дубровенскі	89,5	93,3	83,0	61,4	109,5	48,8	24,2
14.	Гарадоцкі	89,3	101,8	81,9	—	84,1	54,8	10,3
15.	Крупскі	89,0	96,9	82,3	55,2	92,8	38,8	7,7
16.	Сеньненскі	88,8	98,0	98,0	—	82,9	39,5	53,3
17.	Дрысенскі	86,1	86,7	80,8	—	101,3	51,4	36,0
18.	Талачынскі	85,8	98,4	68,6	55,8	89,7	44,2	24,5
19.	Чашніцкі	84,8	91,1	76,2	68,5	92,2	42,6	23,9
20.	Асьвейскі	83,6	93,4	70,0	—	98,5	43,1	19,3
21.	Чавускі	82,2	92,8	77,5	54,4	81,0	30,5	11,0
	Усяго	90,9	101,4	83,5	74,5	95,8	50,0	24,3
	ЖЫВЁЛАГАДОЎЧА-БУЛЬБЯНЫЯ РАЁНЫ							
1.	Чыв.-Слабодзкі	104,4	103,0	103,3	98,0	115,8	97,2	93,2
2.	Крычаўскі	101,5	115,7	92,7	68,9	97,9	48,0	21,7
3.	Капыльскі	99,6	125,5	88,6	72,7	87,5	53,8	47,6
4.	Чэрвеньскі	98,8	106,7	89,6	76,4	85,6	59,8	53,0
5.	Вузьдзенскі	96,9	108,1	78,0	71,7	94,2	44,1	39,7
6.	Клічаўскі	94,5	116,5	87,1	76,2	84,7	20,1	52,9
7.	Чырвонапольскі	93,8	103,1	96,7	82,0	87,4	38,6	21,5
8.	Будз-Кашалеўскі	93,5	111,0	102,8	92,7	85,4	68,5	29,7
9.	Слуцкі	91,9	98,2	73,9	67,7	91,5	61,4	42,9
10.	Жлобінскі	91,8	95,9	95,1	63,8	101,3	43,3	22,4
11.	Асіпавіцкі	91,7	103,6	75,1	82,6	84,8	51,4	8,8
12.	Стара-Дарожскі	91,6	130,0	71,4	54,2	71,0	24,4	11,4
13.	Клімавіцкі	91,1	97,3	75,0	67,0	97,8	51,2	34,7
14.	Касьцюковіцкі	91,0	94,0	103,0	52,5	93,5	52,8	23,0
15.	Плешчаніцкі	90,9	95,0	78,8	84,7	105,3	32,5	39,9
16.	Бярэзінскі	90,6	96,4	87,7	89,0	90,9	45,1	40,4
17.	Пухавіцкі	89,4	99,5	81,9	61,1	92,5	37,0	35,9
18.	Барысаўскі	88,4	111,9	73,3	102,3	76,5	32,6	23,7
19.	Быхаўскі	87,8	102,8	108,1	103,5	81,2	25,9	54,3
20.	Чэрыкаўскі	87,4	109,2	86,4	73,2	77,7	31,9	16,8
21.	Заслаўскі	85,8	104,4	57,7	64,7	83,9	50,8	39,1
22.	Уваравіцкі	84,8	95,3	87,6	29,6	80,1	63,6	35,6
23.	Лагойскі	84,7	107,4	67,9	91,7	62,3	58,9	45,3
24.	Кармянскі	84,5	96,6	88,6	51,7	63,3	27,5	28,7
25.	Брагінскі	84,1	93,8	60,7	66,0	89,1	14,9	15,7
26.	Прапойскі	82,8	88,8	84,4	51,0	77,7	23,3	25,0
27.	Рагачоўскі	82,6	93,9	64,6	72,8	77,3	47,2	27,7
28.	Койданаўскі	78,4	79,6	71,6	72,6	78,5	62,3	32,6
29.	Церахаўскі	78,1	88,6	89,6	76,8	65,7	43,2	17,9
30.	Ваткаўскі	77,8	77,7	89,3	62,9	82,7	62,2	23,0
31.	Чачэрскі	74,1	82,5	82,9	40,5	69,2	15,3	96,2
32.	Смалявіцкі	72,9	76,4	55,8	64,3	70,7	33,5	38,2
	Усяго	88,0	98,4	84,8	65,9	84,7	44,4	37,1
	ЖЫВЁЛАГАДОЎЧА-КАНАПЛЯНАВОДЧЫЯ РАЁНЫ							
1.	Жыткавіцкі	123,1	151,7	118,8	63,5	110,3	76,5	—
2.	Тураўскі	111,4	132,4	164,6	48,2	93,9	85,9	18,5
3.	Ельскі	104,1	107,0	123,5	77,9	101,9	64,2	34,9
4.	Лельчыцкі	101,2	136,9	101,7	61,8	70,0	13,1	—
5.	Глускі	100,1	113,8	95,6	101,7	102,7	49,3	54,1
6.	Старобінскі	100,1	117,5	106,6	61,2	93,0	77,2	11,1
7.	Парыцкі	99,0	118,5	105,1	56,7	87,4	36,3	47,7
8.	Хойніцкі	90,8	99,8	112,9	56,6	94,3	45,6	27,7
9.	Любанскі	87,6	112,1	164,3	46,1	79,0	20,9	31,8
10.	Мазырскі	84,4	94,2	105,7	52,8	86,3	37,8	19,9
11.	Брагінскі	83,7	97,3	104,5	27,9	82,1	32,3	28,5
12.	Лоеўскі	83,6	85,5	108,2	54,8	91,2	66,3	21,8
13.	Пятрыкоўскі	80,7	86,1	100,5	43,5	86,1	45,7	12,0
14.	Рэчыцкі	80,4	84,9	98,0	37,2	86,9	35,8	37,9
15.	Камарынскі	78,6	96,2	114,7	69,3	77,8	39,1	63,3
16.	Нараўлянскі	62,8	65,5	72,4	32,2	70,6	28,2	5,1
	Усяго	89,1	100,9	105,4	51,2	88,0	42,8	23,6
	САДОВА-ГАРОДНЫЯ РАЁНЫ							
1.	Бабруйскі	100,5	119,2	107,4	110,3	94,1	52,9	25,3
2.	Аршанскі	100,2	114,8	77,9	61,9	91,8	54,8	41,1
3.	Гомельскі	96,3	124,8	125,5	58,5	88,5	74,2	7,7
4.	Менскі	96,0	109,8	234,4	—	83,9	81,0	33,2
5.	Віцебскі	88,0	96,1	88,9	—	87,6	68,7	12,8
6.	Магілеўскі	85,8	95,7	94,0	89,1	82,9	36,5	16,4
	Усяго	94,6	109,9	99,6	79,1	88,2	61,4	24,3
	Усяго па БССР	90,0	100,9	85,8	61,1	88,5	48,3	29,8
	Усяго да пляну НКЗ СССР	96,0	99,8	89,8	80,4	99,8	48,3	

Пасеўбюро НКЗБ

Раёны, якія асабліва адсталі ў выкананьні пасеўплянаў

Падводзячы вынікі пасьпяховага правядзеньня трэцяй бальшавіцкай вясны, трэба з усёй рашучасьцю пад крэсьліць тое, што 12 раёнаў БССР **адсталі ў сяўбе,** выканалі пасеўныя пляны ня больш чым на 83 проц.

1) **Нараўлянскі**—62,8 проц., 2) **Смалявіцкі**—72,9 проц., 3) **Чачэрскі** —74,1 проц., 4) **Веткаўскі** — 77,8 проц., 5) **Церахаўскі** — 78,1 проц., 6) **Койданаўскі**—78,4 проц., 7) **Камарынскі**—78,6%., 8) **Рэчыцкі** — 80,4 проц., 9) **Пятрыкоўскі**—80,7 проц., 10) **Чавускі**—82,2 проц., 11) **Рагачоўскі**—82,6 проц., 12) **Прапойскі**— 82,8 проц.

Партарганізацыі гэтых раёнаў павінны нагнаць недасеў шляхам **мабілізацыі** калгасных мас, беднякоў і сераднякоў—аднаасобнікаў **на сваячасовае і добраякаснае правядзеньне ўборчай кампаніі.** Піводнага кілёгрма страт—баявая задача кожнага калгасу, саўгасу і паселішча.

Паляводчыя брыгады пераключыліся на поліва

МАГІЛЕЎ. (Наш кар.). Перадавыя калгасы раёну, скончыўшы сяўбу, пераключыліся на поліва. Калгас **«Сьцяг камунізму»,** Вяліка-Бялевіцкага сельсавету, яшчэ 31 мая скончыў сяўбу. Добра складзеныя паляводчыя брыгады і штодзённае кіраўніцтва імі з боку старшыні праўленьня тав. Іванова, вылучэнца, забясьпечылі посьпех пасеўнай. Калгас выканаў заданьне на 106 проц. Зараз брыгады разгарнулі поліва. На 22 чэрвеня садова-гародная брыгада тав. Кавалёва ўжо скончыла першую праполку гароду. Лепшыя ўдарніцы Кавалёва, Альховіч, Якушкова, Кушлякова і інш. перавыконваюць нормы поліва на 65 проц.

Паляводчая брыгада пачала поліва

ЧЫРВОНАЯ ДОШКА

раёнаў, якія па-ўдарнаму рэалізуюць пазыку сярод гарадзкога і вясковага насельніцтва

(паводле даных на 28 чэрвеня)

1. **Койданаўскі раён** рэалізаваў пазыкі на суму 371.580 руб., што складае 103,2 проц. агульна-раённага пляну.
2. **Аршанскі раён** пашырыў аблігацый на 1.602 тыс. руб., што складае 83,3 проц. агульнага заданьня.
3. **Жыткавіцкі раён** рэалізаваў аблігацый на 109 тыс. руб., што складае 75,5 проц. агульна-раённага пляну.
4. **Дрысенскі раён** пашырыў пазыкі на 239 тыс. руб., што складае 71,7 проц. агульнага пляну.
5. **Мазырскі раён** рэалізаваў пазыкі на 769 тыс. руб., што складае 71,1 проц. заданьня.
6. **Клімавіцкі раён** рэалізаваў аблігацый на 517 тыс. руб., што — 70,7 проц. агульнага пляну.

Тав. ІВАНОЎ—рабочы гарбарні «Бальшавік» падпісаўся на 150 проц. мес. зарплаты.

Падпіска праведзена ў... працаднях

КАПЫЛЬ. (Наш кар.).

Паводле дырэктыў, падпіска на пазыку імя чацьвертага завяршальнага павінна праводзіцца ў рублях, у залежнасьці ад даходу калгасьніка, але ні ў якім разе не ў працаднях. Гэту дырэктыву парушыў работнік Капыльскага РВК — Маляўка. Ён у калгасе «Чырвоны пагранічнік» правёў падпіску ў працаднях. На заўвагу работнікаў сельсавету, што рэалізацыя пазыкі ў працаднях супярэчыць дырэктывам, Маляўка заявіў: «ня можа быць ніякіх пярэчаньняў супроць праведзенай работы, бо я раённы работнік». Самадурству Маляўкі трэба палажыць канец.

Пазыка „4-ты завяршальны год пяцігодкі"

ВЫСОКА ЎЗЬНЯЦЬ МАСАВУЮ РАБОТУ НА ВЁСЦЫ!

На аснове поўнай добраахвотнасьці дабіцца рашаючых посьпехаў у падпіснай кампаніі

Сацспаборніцтва гарадоў БССР на лепшую падпіску

(ПАВОДЛЕ ДАНЫХ НА 28 ЧЭРВЕНЯ ПА ГРУПЕ РАБОЧЫХ І СЛУЖАЧЫХ У ТЫС. РУБ.)

НАЗВА ГОРАДУ	Сума	Проц. выканан.
1. Койданава	216	127,1
2. Мазыр	679	101,3
3. Гомель	4.605	98
4. Ворша	1.188	95
5. Віцебск	3.868	83,2
6. Менск	7.104	81,7
7. Бабруйск	1.925	81,6
8. Рэчыца	773	80,5
9. Барысаў	1.096	73,1
10. Магілеў	1.634	63,8

***

Усяго на 28 чэрвеня па БССР рэалізавана аблігацый на 36.145 тыс. руб., або 53,5 проц. заданьня. Сярод рабочых і служачых рэалізавана 31.683 тыс. руб.—74,9 проц. Сярод неарганізаванага насельніцтва гарадоў—2.552 тыс. р.— 12,5 проц. Сярод калгасьнікаў—1.836 тыс. руб.—21,8 проц. Сярод аднаасобнікоў—78 тыс. руб. Апрача таго рэалізавана сярод рабочых і служачых транспарту пазыкі на 4.850 тыс. руб.

ЗАЎВАГА. У зводцы, зьмешчанай у „Зьвязьдзе" за 28 чэрвеня аб выкананьні кантрольнага заданьня па пазыцы, дапушчан **па віне вучотна-статыстычнай групы кіраўніцтва ашчадкас і дзяржкрэдыту** БССР рад тэхнічных памылак. Народны камісар тав. **Хацкевіч** за няправільнае складаньне зводак, за скажэньне ўліку ходу падпіскі абвясьціў вымову з папярэджаньнем вучотна-статыстычнай групе кіраўніцтва ашчадкас і Дзяржкрэдыту. Абвешчана вымова сакратару кіраўніцтва тав. **Чакорскай.**

Рапарт перамогі

ЖЫТКАВІЧЫ. ДА 26 ЧЭРВЕНЯ САБРАНА ПАДПІСКІ НА ПАЗЫКУ ІМЯ ЧАЦЬВЕРТАГА ЗАВЯРШАЛЬНАГА НА 92.450 РУБ. — 105 ПРОЦ. КАНТРОЛЬНАГА ЗАДАНЬНЯ ПА РАБОЧЫХ І СЛУЖАЧЫХ. ДАМАГАЕМСЯ 100 ПРОЦ. ВЫКАНАНЬНЯ ЗАДАНЬНЯ ПА ВЁСЦЫ.

Каморнік чакае новых установак

Шчарбакоў упарта не жадае ўлічыць урокі вясны. У некаторых мясцох несваячасовы адвод земляў значна тармазіў посьпехі веснавой сяўбы. Для ўнцер-прышыбеевых накшталт Шчарбакова ўсё ні па чым... Ён спакойна засядае ў адным з габінэтаў НКЗБ. Ён загадчык сэктару зямляўпараджаваньня. У яго мэты за ўсё клопатаў аб зямляадводзе, аб сваячасовай уборцы сенажаці.

Дырэктыву спусьціў... Тэлеграмамі пекалькі раз падмацаваў і на гэтым паставіў кропку. Вось мэтад работы Шчарбакова. Адна з такіх тэлеграм прывяла ў замяшаньне ўсіх работнікаў **Рэчыцкага РВК.** Чэрвень месяц на зыходзе, пячэ сонца, а сенаўборка ў лугтасе **«Ведрыч»** не пасоўваецца наперад... Прычынай усяму — тэлеграма Шчарбакова.

Гутарка ідзе аб тэлеграме ад 26 чэрвеня. Зьмест яе зусім кароткі: **«Касіць луггасу плошчу, зацьверджаную НКЗБ — 6.000 га».** Сенажаці, годнай для касьбы, ёсьць 4

Выпусьціць новыя масы ... га спажываньня!

АГЛЯД ДРУКУ

ТЭМПЫ РОСТУ ПРАДУКЦЫІ ШЫРОКАГА СПАЖЫВАНЬНЯ

(Валавая прадукцыя за 5 м-цаў 1932 г. і процант у адносінах да адпаведнага пэрыяду мінулага году)

Прымусіць Беллесправ па-баявому выканаць дырэктывы партыі

Павялічэньне фондаў прамысловых тавараў шырокага спажываньня, хутчэйшае прасоўваньне іх да спажыўца па каналах тавараправодзячай сеткі—важнейшыя ўмовы разгортваньня калгаснага гандлю, пашырэньня таваразвароту паміж горадам і вёскай. Вось чаму перад прамысловасьцю, партыяй і ўрадам пастаўлены вялізарныя задачы мабілізацыі ўсіх унутраных рэсурсаў для максымальнага разгортваньня вырабу прадукцыі шырокага спажываньня.

Вырашэньне гэтых задач датычыць ня толькі лёгкай індустрыі і прамысловай каапэрацыі, якія сваёй прадукцыяй абслугоўваюць шырокі рынак. Вырабляць тавары шырокага спажываньня павінны ўсе, без выключэньня галіны прамысловасьці. Асабліва вялікія магчымасьці для гэтага ёсьць у лясной прамысловасьці, на прадпрыемствах якой штодзенна накапляюцца кучы розных адкідаў, рацыянальнае скарыстаньне і пераапрацоўка якіх можа даць на мільёны рублёў дадатковай прадукцыі.

Як-жа Беллесправ рэалізуе дырэктывы партыі і ўраду па гэтым пытаньні. Вельмі і вельмі марудна. Як па трэсту Белдрэў, так і Лесбелу кантрольныя лічбы из дадатковы выраб прадукцыі шырокага спажываньня да заводаў і леспрамгасаў спушчаны толькі ў апошнюю пяцідзеньку чэрвеня. У выніку большасьцю прадпрыемстваў дагэтуль лічбы не прапрацаваны. Так, на Белдрэву прапрацавалі лічбы і пачалі арганізацыю ўцільцэхаў толькі завод імя Молатава і Бабруйскі камбінат. На Барысаўскім-жа камбінаце гэтым пытаньнем зусім не займаюцца. На лесапільных таксама ніякай работы па арганізацыі вырабу прадукцыі шырокага спажываньня не праведзена. Каранёй кажучы, ні адно прадпрыемства Белдрэву (за выключэньнем заводу імя Молатава) на сёньняшні дзень ні па адзін рубель дадатковай прадукцыі звыш асноўных праграм не дало. Між тым, з часу пастановы ЦК і СНК прайшоў цэлы месяц.

Удзе"ным, як не паяўпасьцю коснасьці і кансэрватызму ў апараце Белдрэву можна тлумачыць такое становішча.

— Кантрольныя лічбы да прадпрыемстваў мы спусьцілі—кажа адзін з работнікаў Белдрэва тав. Пракофьеў—цяпер справа залежыць ад саміх заводаў.

Бязумоўна, што заводзкія арганізацыі павінны аддаць максымум увагі гэтай рабоце. Але няўжо аб'яднаньні арганізаваны толькі для складаньня плянаў і рассылкі іх на месцы. Для таго, каб гэтыя пляны былі выкананы поўнасьцю і ў тэрмін, прадпрыемствам трэба аказаць практычную дапамогу. Перабудова работы іменна ў тым і заключаецца, што кіраўніцтва нізавымі зьвеньнямі праводзіцца не па прынцыпе: «падпісаў і з плеч далоў, а шляхам канкрэтнай дапамогі прадпрыемствам у арганізацыі вытворчасьці і ажыцьцяўленьні ўсіх мерапрыемстваў партыі.

Лесбел далёка ня ўшоў ад Белдрэва. Тут таксама справа далей складаньня плянаў не пайшла. Больш таго, асобныя леспрамгасы ня толькі не распрацавалі кантрольных лічбаў і не прыступілі да арганізацыі дадатковага вырабу прадукцыі, але катэгарычна адмовіліся ад павялічэньня плянаў, прыкрываючыся рознымі «аб'ектыўнымі» прычынамі. Характэрным фактам у гэтых адносінах зьяўляецца адказ дырэктара бабруйскага транзітнага складу, у веданьні якога знаходзіцца шпалаабрэзачны завод:

> «Кіраўніку Лесбелу.
>
> Нас крайня цікавіць, чаму невядома Лесбелу, што варштаты нашага заводу маюць поўную нагрузку... дрэннае снабжэньне рабочых пескрабкопам і райснабам не дае магчымасьці навербаваць рабочую сілу..., а таму дадатковая колькасьць прадукцыі да нашага пляну ня можа быць прынята.
>
> Дырэктар складу КАГАН.

Камэнтары да гэтых разважаньняў непатрэбны. Апартуністычная іх сутнасьць ясна.

А вось другі факт, які характарызуе імкненьні асобных леспрамгасаў пакрыць дадаткова вызначаную праграму прадукцыяй, якая ўжо вырабляна і ляжыць из складах. У выкананьне дырэктывы Лесбелу Бялыніцкі леспрамгас пішна загадчыку Друцкага складу:

> «Усю паказаную колькасьць прадукцыі (у адносіне паказваецца канкрэтна, якая прадукцыя), якая зараз ёсьць на складзе і яшчэ не заняраджана, вы павінны будзеце перадаць Белкаапсаюзу для збыту на шырокі рынак».

Перадаць Белкаапсаюзу прадукцыю, якая ляжыць на складах, патрэбна і неабходна, але ад гэтага фонд прамысловых тавараў ніколькі не павялічыцца. Тэаба паладзіць і пераапрацоўку адкідаў.

Такое становішча з разгортваньнем вырабу прадукцыі шырокага спажываньня па двух буйных трэстах Беллесправу патрабуе ад упаўнаважанага Наркамлесу рашучых мер да кіраўніцтваў даных трэстаў. Трэба прымусіць іх па-баявому выконваць дырэктывы партыі і ўраду.

Некалькі слоў аб транспартных лясных гаспадарках. У іх таксама ёсьць шмат адкідаў, частка якіх збываецца ў няплянавым парадку розным арганізацыям і ўстановам, а частка зусім гніе ў лесе і на складах. Між тым, у гэтых гаспадарках ніякай работы па арганізацыі пераапрацоўкі адкідаў у прадукцыю шырокага спажываньня не праводзіцца.

Ф.

МЭТАЛЯЗАВОДЫ ЯШЧЭ ТОЛЬКІ РАЗВАРУШВАЮЦЦА

Белмэтапяаб'яднаньне не аказвае канкрэтнай дапамогі

На буйнейшых мэталапрацоўчых заводах Менску выраб прадметаў шырокага спажываньня не набыў яшчэ патрэбнага размаху. Машынабудаўнічыя заводы гораду — імя Варашылава, «Камунар», «Ударнік» — прыступілі да канкрэтнага ажыцьцяўленьня гэтай задачы толькі ў сярэдзіне чэрвеня. Выраб прадметаў шырокага спажываньня на заводзе імя Варашылава пачаўся толькі 15 чэрвеня, на «Камунары» і «Ударніку» — 17-га.

Некаторых посьпехаў дабіўся завод імя Варашылава. За апошнія два тыдні ён вырабіў 200 падкоў, 150 калёсных шворнаў, 300 буксаў, 100 пар атос для калёс, 1.000 адвалаў, 1.000 лемяхоў, 50 трыножак і 200 пар завес з кручкамі.

Выпушчана таксама значная колькасьць кухонных вілак, качэргаў, чапелаў і інш.

Да 28 чэрвеня выраблена з адкідаў мэталю розных прадметаў на суму больш 8.000 руб. Зараз у кавальскім цэху заводу арганізавана спэцыяльная брыгада на чале з брыгадзірам тав. **Ключом**, якая выключна занята вырабам прадметаў шырокага спажываньня. У бліжэйшыя дні будзе абсталявана уцільцэх на 20 чал., які апрача адзначанай прадукцыі будзе яшчэ вырабляць замкі.

Мэталяаб'яднаньне дало заводу заданьне выпусьціць прадметаў шырокага спажываньня на 32.000 руб. Варашылаўцы высунулі сустрэчны — да канца году цэх павінен даць прадукцыі на 100.000 руб.

Аднак, завод імя Варашылава зрабіў далёка ня ўсё, што можна. На заводзе ёсьць сотні тон уцільмэталю, які яшчэ не сабраны і ня ўлічан. Поўнае скарыстаньне гэтых адкідаў можа даць дадатковай прадукцыі на дзесяткі тысяч рублёў.

На заводзе **«Камунар»** ужо выраблена 2.000 вёдраў, 20 вілак, 160 малаткоў, 100 жароўняў. Пачалі рабіць сякеры. Створана брыгада па скарыстаньні адыходаў у кавальскім цэху з 6 чал., у бляшаным — з трох. Але брыгада кавальскага цэху сыстэматычна адрываецца начальнікам цэху ад непасрэдна даручанай ім работы і скарыстоўваецца на іншых вучастках. Гэты факт трэба кваліфікаваць як ігнараваньне вырабу прадметаў шырокага спажываньня. Вышэй прыведзеныя лічбы выраблепай прадукцыі гаворяць аб вусім невыстарчальным разгортваньні работы па скарыстаньні ўцілю на заводзе «Камунар». Паводле запраектаваньняў, завод павінен даць у трэцім квартале дадатковай прадукцыі на 110.625 руб. Праведзеная падрыхтоўка зусім не забясьпечвае выкананьне гэтай адказнай задачы.

Надзвычай мала зроблена на заводзе **«Ударнік»**. Аб гэтым гаворяць лічбы выпушчанай прадукцыі: 300 падкоў, 20 долатаў, каля 10 кухонных вілак і 13 ложак. Распачат выраб замкоў. Праўда, мерканьні заводу вялікія. Да канца году ён намеціў выпусьціць 10.000 замкоў, 10 тыс. падкоў, 10.000 чапелаў і інш., але гэтыя лічбы пакуль што толькі фігуруюць у плянах і праектах. Практычна нічога ня зроблена, каб забясьпечыць ажыцьцяўленьне гэтай пратрамы.

Некалькі слоў аб рэалізацыі прадукцыі. Нашы мэталапрацоўчыя заводы павінны ў максымальна кароткі тэрмін праз ЗРК, сыстэму каапэрацыі прасунуць тавар да рабочага і калгаснага спажыўца. На справе-ж атрымліваецца адваротнае. Выраблены прадметы цэлымі дэкадамі і больш ляжаць на складах ЗРК і на прадпрыемствах. Так, у ЗРК заводу «Камунар» больш дэкады ляжаць не рэалізаваных 500 жароўняў, 200 самаварных труб, 200 вілак і 400 малаткоў. На 1.000 руб. марыпуецца гатовых вырабаў у ЗРК заводу імя Варашылава.

Белмэталяаб'яднаньне, якое павінна ўзначаліць работу па вырабе прадметаў шырокага спажываньня, не наладзіла канкрэтнай практычнай дапамогі заводам у арганізацыі вытворчага працэсу. Да гэтага часу ў БМА няма выразнага пляну, колькі і чаго павінна быць выраблена за лік скарыстаньня адыходаў. Плян, спушчаны на прадпрыемствы ў 683.000 руб., прадугледжвае і скарыстаньне поўнацэннага мэталю. Работнік сэктару рацыяналізацыі народнага камісарыяту Цяжпраму замест практычнай дапамогі заводам «Камунар» і «Ударнік» займаўся толькі зборам вестак аб вырабе прадметаў шырокага спажываньня.

Плян на другое паўгодзьдзе спушчан прадпрыемствам толькі гэтымі днямі.

Н—н.

Уцільцэх заводу імя Варашылава (брыгадзір тав. КЛЮЧ выпрацоўвае тверны, падковы, адвалы, лемяхі, буксы, завесы, шыны і г. д.

Вагон і крэсла

(„Палеская праўда", „Цянік сацыялізму", Гомель)

У Гомелі слова—уцільцэх—спаткалі яўна варожа, з гіранічнай зьнявагай. Не падумайце, аднак, што гэта датычыць усіх рамяльчан. Гутарка ідзе пра гомельскіх гаспадарнікаў.

Яны абурыліся. Крыўда, поўная і незаслужаная крыўда. Падумайце толькі: нашы заводы, можна сказаць, гіганты, мы выпускаем машыны і вагоны, а тут патрабуюць яшчэ нейкіх каструль...

Гомельскіх, мякка кажучы, панікёраў ахапіла вялікае сумненьне. На Гомсельмашы, напрыклад, былі ўпэўнены, што нельга

> «...выпускаць сілапарэзкі, быць адзіным заводам у СССР па выпуску гэтай прадукцыі і тут-жа адначасова займацца вырабам вёдраў, каструль, а можа яшчэ і самаварных труб» («Палеская праўда» ад 26 чэрвеня).

І так, самаварныя трубы—гэта проста нейкі кашмар, адкрыты замах на прэстыж прадпрыемства. Аналёгічныя думкі апанавалі і гаспадарнікаў з заводу імя Ланцуцкага. Яны таксама абурыліся і ўчапіліся рукамі і нагамі за тэпар свайго мэндзіру:

> «...як гэта заводу імя Ланцуцкага, які выпускае новыя паштовыя вагоны, тут-жа заняцца вырабам сталоў, крэслаў, а можа і яшчэ якіх-небудзь дробязяй для калгасьнікаў».

«Палеская праўда» зусім правільна (хаця і з некаторым спазьненьнем) рэзка ўдарае па такіх шкодных настроях. Яна жорстка выкрывае кансэрватызм і бязьдзейпасьць тых гаспадарнікаў, якіх так палохаюць каструля, або самаварная труба. З фактамі і лічбамі ў руках газэта паказвае, **якімі вялікімі магчымасьцямі ўладаюць гомельскія прадпрыемствы** для арганізацыі масавага выпуску тавараў шырокага спажываньня. На адным толькі заводзе імя Ланцуцкага

> «...з дубовых і сасновых адыходаў дрэваапрацоўчага цэху можна рабіць такія буйныя рэчы, як шафы, не гаворачы ўжо аб табурэтках, дзіцячых ложках, крэслах і інш.»

Гэта яшчэ ня ўсё. На заводзе ёсьць у вялікай колькасьці адыходы рэсорнай сталі. З іх можна выраблянь самыя рознастайныя дробныя сельскагаспадарчыя рэчы. З адыходаў чыгуну, а іх на заводзе даволі, можна выпускаць добрыя патэльні.

Такое-ж становішча і па Гомсельмашы. Хаця там і знайшліся людзі, якія сьмяюцца з вёдраў і каструль, але факты настойліва таласуюць імен па і за вядро і за каструлю. На заводзе з месяца ў месяц накапляюцца дзесяткі тон адыходаў дэфіцытнага мэталю. Прыблізны падлік паказвае, што, скарыстаўшы іх, Гомсельмаш можа выпусьціць за кароткі тэрмін на 70.000 р. тавараў шырокага спажываньня. Астаноўка толькі за тым, каб хутчэй і лепш мабілізаваць уласныя заводзкія рэсурсы. Астаноўка за тым, каб

> «...спалучыць выпуск новага вагона—з табурэткай, сілапарэзкі—з вядром, скарыстаўшы адыходы».

Рэдакцыя «П. П.» у пэўнай меры сама была захоплена, так сказаць, антыкаструльнымі настроямі. Прынамсі, у першай палове чэрвеня газэта ні слова не сказала аб арганізацыі ўцільцэхаў на гомельскіх прадпрыемствах. Але, страціўшы столькі каштоўнага часу («Палеская праўда»—штодзенная газэта), рэдакцыя цяпер актыўна нагоняе прапушчанае.

Заслуга газэты ў тым, што яна перш за ўсё выкрыла сабатаж тых гора-гаспадарнікаў, якія нічога ня бачаць далей уласнага носа. «П. П.» мабілізуе рабочую грамадзкасьць па барацьбу за разгорнуты выраб тавараў шырокага спажываньня высокай якасьці і патрэбнага асартымэнту, падкрэсьліваючы, што выпуск гэтых тавараў—такая-ж ганаровая задача гомельскіх пралетараў, як і выпуск машын і вагонаў.

> «Выканаць гэту задачу—піша газэта—правяліць уласную ініцыятыву—справа гонару кожнага дырэктара, кожнага майстра і рабочых гомельскіх прадпрыемстваў».

Лёзунг «П. П.»:

— Арганізуем на кожным прадпрыемстве уцільцэх.

Справа, зразумела, не ў адных толькі лёзунгах. «Палеская праўда» ў разгорнутай карэспандэнцыі «Уцільцэху—пастаяннае памяшканьне» паказвае, як гомельскія прадпрыемствы прыступаюць да выпуску тавараў шырокага спажываньня. Хаця некаторыя скэптыкі з заводу імя Ланцуцкага і ня хочуць пэцкаць рукі аб «нейкія сталы і крэслы», усё-ж на заводзе цяпер.

> «...арганізуецца уцільцэх. Майстар гэтага цэху тав. РАБЧЫНСКІ ВЕЛЬМІ АХВОТНА ЎЗЯЎСЯ ЗА АРГАНІЗАЦЫЮ ВЫТВОРЧАСЬЦІ. На работу будуць пастаўлены тры высококваліфікаваныя сталяры шостага разраду, чатыры сьлесары і на першы час адзін каваль і малатабоец».

Так рабочая ініцыятыва ламае сабатаж бюракратаў. «Палеская праўда» не павінна абмежавацца толькі фіксацыяй факту. Трэба дабіцца, каб уцільцэх на заводзе імя Ланцуцкага неадкладна прыступіў да работы. Трэба з яшчэ большай жорсткасьцю выкрываць кожнага, хто адкрыта ці замаскавана супраціўляецца арганізацыі ўцільцэхаў.

А такіх людзей у Гомелі, відавочна, мяркуючы па матар'ялах «П. П.», ня мала. Узяць хоць-бы той-жа Гомсельмаш. Тут ёсьць што хочаце: пляны, рэзалюцыі, пастановы аб выпуску тавараў шырокага спажываньня, няма толькі... практычнай работы. Людзі пішуць, пастанаўляюць, а на справе ўпарта чапляюцца за свой гнілы і шкодны дэвіз: соромна адзінаму ў СССР заводу па выпуску сіласарэзак займацца вёдрамі або (які жах, якая ганьба!) самаварнымі трубамі.

> «Аддзел рацыяналізацыі Гомсельмашу,—як паведамляе «П. П.,—распрацаваў канкрэтны план арганізацыі уцільцэху. Згодна плану на уцільцэху павінна быць пабудавана асобная кузьня з устаноўкай роду варштатаў. Павінен быць таксама арганізаваны склад для зборкі і сарпоўкі адыходаў».

План, як бачыце, ёсьць. Нішто сабе плян. Бяда толькі ў тым, што яго фактычна і ня думаюць ажыцьцяўляць. Часовую майстэрню для выпуску тавараў шырокага спажывання на заводзе, як піша «П. П.», арганізуюць ужо некалькі тыдняў, але

> «...справа дагэтуль не пасунулася».

Іншымі словамі, майстэрня ўсё яшчэ «арганізуецца». Можна прадставіць, калі-ж будзе арганізоваан сім уцільцэх пры такіх рабскіх тэмпах работы. Трэба выявіць бюракратаў, якія ўмеюць ухваляць пляны, але не жадаюць іх ажыцьцяўляць. Выявіць і выкрыць неадкладна, накіраваўшы на гэтых людзей арасьць мас, як на тых, хто тармозіць выкананьне баявых дырэктыў нашай партыі.

«Палеская праўда» становіцца на шлях актыўнай барацьбы за масавы выпуск тавараў шырокага спажываньня. На жаль, нельга гэтага сказаць пра нізавы друк гомельскіх заводаў і фабрык. Заводзкія газэты ўсё яшчэ маўчаць. Маўчаць у поўным сэнсе гэтага слова. Яркай ілюстрацыяй можа служыць шматтыражка «Цянік сацыялізму» (завод імя Ланцуцкага).

«Ц. С.» і па сёньняшні дзень не сказаў ні слова аб лёсе уцільцэху на сваім заводзе. На яго старонках можна знайсьці ня мала гучных заклікаў да паляпшэньня культурна-бытавых умоў рабочых. Газэта ня раз пісала аб задачах калгаснага гандлю. Пісала, заклікала, растлумачвала. Забыла напісаць толькі аб адным: як сам завод дапамагае разгортваньню калгаснага гандлю.

Чаму?

Невядома.

Напэўна рэдакцыя таксама лічыць, што «нельга выпускаць новыя паштовыя вагоны і тут-жа займацца вырабам сталоў і крэслаў, а можа і яшчэ якіх-небудзь дробязяй для калгасьнікаў».

***

Наш друк слаба змагаецца за бальшавіцкую арганізацыю масавага выпуску тавараў шырокага спажываньня. З гэтым трэба пакончыць і прытым неадкладна. Штодзенна, канкрэтна і апэрацыйна ўзьнімаць рабочыя масы на барацьбу за хутчэйшую арганізацыю уцільцэхаў, за бесьперабойны выпуск тавараў шырокага спажываньня—**справа гонару ўсяго друку.**

Усё зроблена... на паперы

Ня гледзячы на выразныя дырэктывы аб разгортваньні вырабу прадметаў шырокага спажываньня, скураны і абутковы трэсты БССР да сёньняшняга дня не наладзілі работы на прадпрыемствах па скарыстаньні адкідаў вытворчасьці і вырабу з іх абутку і інш. рэчаў. Толькі 27 чэрвеня гэта пытаньне разглядалася на пасяджэньні камісіі скуранога трэсту, на якім намечан рад заданьняў прадпрыемствам. Гомельскаму аўчынна-шубнаму заводу прапанавана пашыць у трэцім квартале з адкідаў 357 кажухоў, 368 шапак, 516 рукавіц і 300 пар хатніх туфлей. Завод імя Сталіна за гэты-ж час павінен даць з адыходаў 1.000 пар галовак і 3.000 пар загатовак. Паводле намячэньняў, гарбарня «Бальшавік» павінна выпусьціць з адыходаў у трэцім квартале скуры на 450 пар розпага абутку і даць 800 кгр. шчаціны.

Аднак, далей складаньня пляпаў справа не пайшла. Пляны гэтыя ляжаць у папках канцылярый, а па заводах ніякай работы не праведзена. Канкрэтная дапамога ім не аказала.

ТАК ДАЛЕЙ ПРАЦАВАЦЬ НЕЛЬГА

Партыя і ўрад паставілі перад прамысловасьцю галоўную, ударную задачу: **у найкарацейшы тэрмін даць краіне максымум прадметаў шырокага спажываньня.** Гэта патрабаваньне ўладарна дыктуецца самымі надзенными інтарэсамі пралетарскай дзяржавы. Праблема тавараў шырокага спажываньня — вядучае зьвяно нашага гаспадарчага разьвіцьця на сучасным этапе, важнейшая ўмова паскарэньня тэмпаў сацыялістычнага будаўніцтва.

Сваячасова выканаць дырэктывы аб пашырэньні фондаў прамтавараў — гэта значыць зрабіць поўнакроўным таваразвароту паміж горадам і вёскай, гэта значыць умацоўваць савецкі рубель, гэта значыць стварыць моцны стымул для разьвіцьця калгаснага гандлю, гэта значыць забясьпечыць новыя рашучыя сэрухі ў справе ўздыму матар'яльных умоў рабочай класы, калгасьнікаў і серадняковаў — адначасобнікаў.

Вялізарнае гаспадарча-палітычнае значэньне шырспажыву са ўсёй сілай падкрэсьлена ў радзе партыйных дакумантаў. Гэта абавязвае кожную гаспадарчую арганізацыю прыкласьці ўсе сілы да таго, каб кожны дзень сваёй работы ператварыць ва ўдарны настойлівы штурм прамфінпляну, каб скарыстаць усе магчымасьці для выпукваньня дадатковых крыніц сырцу, для поўнай уцілізацыі адкідаў прамысловасьці.

Даным артыкулам ставіцца мэта асьвятліць работу наркамату лёгкай прамысловасьці БССР у частцы ажыцьцяўленьня дырэктыў партыі па выпуску тавараў шырспажыву.

Вядома, высокая ўдзельная вага лёгкай прамысловасьці БССР у агульным балянсе прамтавараў. Зразумела адгэтуль і тая адказная роля, якую заклікан граць наркамат лёгкай прамысловасьці, кожнае зьвяно яго апарату ў справе барацьбы за шырспажыў.

Як-жа працякае гэта работа ў наркамаце? Якія першыя вынікі?

Нарком тав. **Грысевіч** у гутарцы з брыгадай сказаў: «Сьпісана шмат паперы, дырэктыў дана больш, чым патрэбна. Але ў аб'яднаньнях і на мясцох ніхто нічога ня робіць. Не паладзіў яшчэ жывога кіраўніцтва і кантролю і сам наркамат. Практычных рэзультатаў пакуль яшчэ ня відаць». Гэта заява адбівае сапраўдны стан рэчаў у НКЛПБ.

Барацьба за дадатковыя тавары шырспажыву ў лёгкай прамысловасьці фактычна яшчэ не разгарнулася. Не паказвае прыкладу апэрацыйнасьці і ўдарных тэмпаў і апарат Наркамату.

Уся работа па выпукваньні дадатковых магчымасьцяй для вырабу прамтавараў пачалася са значным спазьненьнем. Рэзка кідаецца ў вочы маларухомасьць, марудпасьць. Горы паперы і вельмі мала жывой работы.

Вось як, напрыклад, выконваліся наркаматам дырэктывы саюзных цэнтраў, а значыцца разгортваліся і практычная работа па пытаньнях шырспажыву ўнутры апарату.

Пачынаючы **з сакавіка** НКЛП Саюзу ня раз патрабаваў распрацоўкі мерапрыемстваў па максымальным вырабе прадметаў шырспажыву. Гэтыя дырэктывы выкананы толькі **20 чэрвеня.** Яшчэ 4 чэрвеня НКЛП Саюзу канставаў, што ад НКЛПБ «не паступіла абсалютна ніводнай прапановы па павялічэньні вырабу шырспажыву за лік мабілізацыі ўнутраных рэсурсаў». 28-га мая на гэты-ж факт зварачаў увагу НКЛПБ, прадстаўніцтва БССР пры ўрадзе Саюзу.

Ня менш характэрны другі факт. «Союзстеклофарфор» 8 мая пішна, што, з прычыны неатрыманьня адказу па пытаньні аб пераводзе частві прадпрыемстваў на выраб гаспадарчай пасуды, ён вымушан сам вызначыць гуту «Пралетары».

Гэтыя факты вельмі паказальны. Яны ясна гавораць аб тэмпах работы наркамату, у значнай ступені паказваюць прычыны тых зрываў, якія ёсьць у галіне вырабу шырспажыву. Справа, вядома, ня толькі ў спазьненьнях з адказамі на запытаньні, а ў тым, што практычная работа па пашырэньні вырабу прамтавараў недапушчальна зацягвалася. **Там, дзе абстаноўка патрабавала вырашэньня пытаньня ў днях, справа цягнулася дэкады і месяцы.**

Ці-ж ня дзіўна, што калегія НКЛПБ **упяршыню** паставіла пытаньне аб шырспажыве толькі на сваім пасяджэньні ад **17 мая?** Няўжо пармальна, што распрацоўка заданьняў аб'яднаньнем цягнулася некалькі **месяцаў,** што якіх-небудзь практычных рэзультатаў, сапраўднага павялічэньня фондаў прамтавараў амаль няма і па сёньняшні дзень.

Выключна вялыя тэмпы і нізкая якасьць пастаноўкі справы парадкалася адсутнасьцю ў наркамаце выразных арганізацыйных форм работы, вельмі слабой праверкай выкананьня дырэктыў, невыстарчальнай канкрэтнасьцю кіраўніцтва аб'яднаньнямі, габлізтнымі мэтадамі работы.

Пытаньнямі вырабу прадметаў шырспажыву займаліся і калегія, абмяркоўваліся яны і па нарадах пры плянавым сэктары, працавала спэцыяльная камісія. Але функцыі разьмежаваны ня былі, фактычна ўсюды рабілася адно і тое-ж.

Пытаньні, якія абгаворваліся, ня выходзілі з рамак плянаваньня, разьмеркаваньня фондаў і ўстанаўленьня заданьняў. Мерапрыемствы па практычным ажыцьцяўленьні праграм, апэрацыйнае кіраўніцтва ў гэтых адносінах адсутнічаюць. Пастановы як камісіі, так і калегіі носяць у большасьці выпадкаў характар канстатацыі хранічнага невыкананьня даручэньняў, адсутнасьці работы ў аб'яднаньнях. Звычайна сьледуюць стэрэатыпныя прапановы «ўзмацніць работу», «адзначыць недапушчальнасьць» і г. д. Большасьць пастаноў, у тым ліку і калегіі, засталіся на паперы. Нават такое мерапрыемства, як склікаьне масавай нарады па пытаньнях шырспажыву, у жыцьцё не праведзена. Па неаднаразовых дакладах шэфаб'яднаньня выносіліся традыцыйныя пастановы аб нездавальняючай рабоце.

Далей справа ня ішла.

Канкрэтныя вінаватыя не знаходзіліся. Ніякіх мер у адносінах да іх ня ўжывалася. Ні адзін работнік, які тармазіў работу, да апошняга часу ня быў прыцягнут да адказнасьці.

Між тым, якая недаацэнка ролі шырспажыву, і нават супраціўленьне гэтай справе з боку аб'яднаньняў і іх асобных работнікаў былі далёка не адзінымі.

У найбольш адкрытай форме гэта праяўлена работнікамі **Белшвэйаб'яднаньня.** У дакладной запісцы ў НКЛПБ ад 3-VI аб пашырэньні асартымэнту прадукцыі, плянавы аддзел Белшвэйаб'яднаньня піша:

«Увесь вышэйпаказаны асартымэнт можна выкананць пры ўмовах, калі пашырыцца плошча новых фабрык, бо існуючы асартымэнт таксама зьяўляецца неабходным і замяніць замест адпаго прадмета другім не прадстаўляецца магчымым. Для пашырэньня вышэйпаказанага асартымэнту і скарыстаньня ўсіх рэштак і адыходаў патрэбна: а) скончыць корпус фабрыкі «Кастрычнік», што дасьць магчымасьць разьмясьціць увесь жаночы асартымэнт як шарсьцяны, так баваўнянапапяровы і шаўковы, б) пашырыць плошчу фабрыкі імя Крупскай за лік школы, занятай шофэрамі, дзе можна будзе разьмясьціць пашыраны цэх бялізны, в) для вырабу поўнага асартымэнту дзіцячай вопраткі патрабуецца спэцыяльная фабрыка. Большасьць прадметаў з вышэйпаказанага асартымэнту можна будзе выраблянь з паяўных у нас рэштак і адыходаў, якія па сёньняшні дзень прадаюцца. Другі варыянт для пашырэньня асартымэнту можа быць за кошт зьмяншэньня існуючага пляну».

Дакладная запіска падпісана нам. загадчыка плянавага аддзелу Белшвэйаб'яднаньня **Шапіра,** але цяжка прадпалажыць, каб такі дакумант мог пайсьці бяз санкцыі кіраўніцтва аб'яднаньня. Ці патрэбен яшчэ больш яркі прыклад грубейшага скажэньня дырэктыў партыі і ўраду, яўнага нежаданьня разумець таго, што не праз гады, а сёньня, заўтра, у самы шыпкарацейшы тэрмін трэба вышукаць дадатковыя фонды прамтавараў для пасычэньня савецкага рынку, што заражжа, не адкладваючы ні на адзін дзень, патрэбна паставіць на лёза нажа ўвесь комплекс пытаньняў аб поўнай мабілізацыі ўнутраных рэсурсаў.

Як-жа рэагавалі на гэты абуравочы факт НКЛПБ? Справа абмяркоўвалася гутаркамі па гэтым пытаньні на камісіі шырспажыву. Дзіўна, што калегія нават не зацікавілася зусім гэтым фактам. Ён нават повядомы намесьніку наркома тав. **Валасевічу,** які непасрэдна кіруе ўсёй работай па шырспажыве. **Ніякіх палітычных вывадаў з гэтай справы ня зроблена.** Прайшлі міма яго і ячэйкі наркамату і аб'яднаньня. Справа патапула ў папках камісіі тав. **Айзэнсона.**

Другі ня менш характэрны прыклад простага зрыву работы. Пытаньне найхутчэйшай адгрузкі тавараў для вясковага рынку адыгрывае выключна важнае значэньне. Па-свойму разумее яго былы начальнік віцебскай базы Саюзтрыкатажу — **Хазанаў.** На распараджэньне Наркамлёгпраму аб неадкладнай адгрузцы тавараў каапэрацыі пай сетцы, ён малпіруе: «Адгрузка для вёскі затрымліваецца 13 лесазаводам неасартымэнтнай падачай планак да яшчыкаў, якія сьледуюць па параду».

Сапраўды — «непераможная» перанікода. Асабліва, калі ўлічыць што лесазавод № 13 знаходзіцца ў тым-жа Віцебску. Гэта-ж просты зрыў важнейшай справы. Нельга ня выказаць задаваленьня, што адказам НКЛПБ на тэлеграму зьявілася зьніцьце Хазанава з работы і прыцягненьне яго да судовай адказнасьці.

Адным з найбольш буйных недахопаў у рабоце наркамату зьяўляецца абсалютна **невыстарчальная ўвага да мабілізацыі ўнутраных рэсурсаў, у прыватнасьці, да стварэньня ўцільцэхаў.** На калегіі пытаньне аб уцільцэхах зусім не абгаворвалася. Доўгі час наогул дыскусавалася мэтазгоднасьць арганізацыі ўцільцэхаў у сыстэме лёгкай прамысловасьці. Яшчэ і зараз ня скончыліся гаданьні наконт таго — ці хопіць адкідаў для ўцільцэхаў і прамкаапэрацыі.

Наогул вучастак работы ў частцы ўцільцэхаў аказаўся ў наркамаце зусім бясспрытульным. Толькі гэтымі днямі вылучан спэцыяльны работнік і выдан загад аб парадку арганізацыі работы на прадпрыемствах. Але яшчэ і ў наркамаце, не гаворачы ўжо пра аб'яднаньні, ня створана бюро выкарыстаньня адкідаў, устаноўленае НКЛП Саюзу. У рэзультаце ўсяго ўцільцэхі толькі арганізуюцца. Чэрвень месяц прайшоў у нікчэмных гутарках, ня даў абсалютна ніякіх практычных рэзультатаў. Магчымасьць-жа выкарыстаньня адкідаў вялізарная.

Сярод прычын, якія парадзілі зрывы ў рабоце па вырабе шырспажыву, трэба ўказаць **поўную адсутнасьць дзейснага кантролю за выкананьнем.** У камісіі наркамату па шырспажыве нэрсанальнай адказнасьці за пэўныя галіны работы ўстаноўлена ня было. Уся работа вялася абязьлічана. **Зусім бязьдзейнічаў сэктар кантролю выкананьня.** Увесь яго ўдзел выказаўся ў праверцы сваячасовага спуску дадатковых заданьняў да аб'яднаньняў. Але і гэта зроблена амаль праз месяц. **Да прадпрыемстваў сэктар кантролю зусім ня спускаўся.** Калегія не заслухала сэктару ні разу. У большасьці аб'яднаньняў работнікаў па праверцы выкананьня няма. Ды і ў наркамаце ў апошнія месяцы працаваў усяго адзін чалавек. Кіраўнік сэктару кантролю тав. **Сьмірноў** адчувае сябе зусім бездапаможна і толькі безнадзейна разводзіць рукамі.

Работа, якая патрабуе мабілізацыі самых шырокіх мас рабочых і спэцыялістаў, наркаматам вялася чыста кабінэтным шляхам. Гэта-ж самае назіраецца і ў аб'яднаньнях. Створаныя тут спэцыяльныя **камісіі па шырспажыве зусім не разгаружылі работу.**

Жывой сувязі, дапамогі прадпрыемствам ня было. Канкрэтныя задачы кожнага заводу, фабрыкі, на сходах рабочых не абгавораны. Калі 23 чэрвеня на прадпрыемствы Менску і ў аб'яднаньні было паслана некалькі брыгад, дык яны маглі канстатаваць толькі поўную адсутнасьць якіх-небудзь зрухаў, практычных рэзультатаў у выпуску дадатковага шырспажыву.

У чым выказаўся **[illegible] ел партарганізацыі НКЛПБ** у барацьбе за тэмпы і якасьць работы апарату? Амаль ні ў чым. Да апошніх дзён ні бюро, ні ячэйка гэтымі пытаньнямі не займаліся. Толькі 27 чэрвеня адкрыты партсход абгаварыў гэта пытаньне, але і тут у сваёй пастанове стаў на шлях падмены адміністрацыйнага кіраўніцтва наркамату, даручыўшы бюро ячэйкі мабілізаваць для пасылкі на прадпрыемства 10 таварышоў. А вось даклады **аб рабоце асобных камуністаў і сэктароў, якія непасрэдна зьвязаны з пытаньнямі шырспажыву, ні разу не сталі ні на бюро, ні на сходах.** Партячэйка апартуністычна недаацаніла значэньня праблемы шырспажыву, прайшла міма тых задач, якія непасрэдна яе закранулі. У баку ад барацьбы за шырспажыў стаіць і ўся грамадзкасьць наркамату. Пасьцісэзота ні сказала ні аднаго слова. Бязьдзейнічае камсамол, прафарганізацыя.

Які-ж агульны стан справы ў галіне выпуску шырспажыву? **Зусім нездавальняючы.** Асноўны прамфінпляц лёгкай прамысловасьці ня выконваецца. За пяць месяцаў рэалізавана толькі 88,8 проц. заданьня. Гэта азначае, што краіна недаатрымала прамысловай прадукцыі на 17,2 млн. руб. Дзьве дэкады чэрвеня паказваюць 58,3 проц. месячнага пляну. **Дадатковы

VI пленум ЦК ЛКСМБ

КАЛГАСНАЙ ЯЧЭЙЦЫ КАМСАМОЛУ— КАНКРЭТНАЕ КІРАЎНІЦТВА

Пытаньне аб рабоце калгаснай ячэйкі ЛКСМБ, — гаворыць дакладчык тав. **Камароў**, — трэба разглядаць па шэнуне з пункту погляду барацьбы камсамольскай ячэйкі за ўсю суму задач арганізацыйна-гаспадарчага ўмацаваньня калгасаў.

ЦК партыі за апошнія месяцы прыняў рад надзвычай важных пастаноў аб чарговых задачах арганізацыйна-гаспадарчага ўмацаваньня калгасаў. У аснову арганізацыі працы ў калгасах пакладзена вытворчая брыгада. Зараз уся сума пытаньняў арганізацыі працы ў калгасе, нармаваньня яе, улік, ліквідацыя абязьлічкі вырашаюцца па сутнасьці ў брыгадзе. Вялізарнейшую ўвагу ЦК партыі аддае ў сваёй пастанове ад 4 лютага ўмацаваньню, падрыхтоўцы і выхаваньню калгасных кадраў і рабоце з калгасным актывам.

Аднэй з асноўных задач, якая вынікае з апошніх пастановаў партыі, выяўляецца барацьба за павышэньне ўраджайнасьці, барацьба за пазышэньне таварнасьці стада, за павышэньне ўдойнасьці і апаросу. Гэта задача пакладае на камсамольскую ячэйку вялікую адказнасьць за разгортваньне агратэхнічнай работы і вымагае ад яе такой пастаноўкі тэхнічнай вучобы, каб кожны камсамолец-калгаснік і ў першую чаргу актывіст сапраўды па справе аўладаў рознымі відамі агратэхнікі. Побач з гэтым камсамольцы-калгаснікі павінны ясна ўяўляць сабе асноўную спэцыялізацыю свайго калгасу, асноўны яго гаспадарчы напрамак, разумець, што выгадней ва ўмовах данага калгасу і з пункту погляду задач, якія стаяць перад рэспублікай. Задача заключаецца ў тым, каб кожная ячэйка ў калгасе па-бальшавіцку змагалася **за павышэньне калгаснай вытворчасьці, за арганізацыйна-гаспадарчае ўмацаваньне калгасаў.**

Працуючы пад кіраўніцтвам партыйнай арганізацыі, рашуча змагаючыся з усякімі праяўленьнямі ўхілаў ад генэральнай лініі партыі, перамагаючы супраціўленьні правых апартуністаў і «лявацкіх» элемэнтаў, калгасныя ячэйкі ЛКСМБ маюць значны балянс у сваёй рабоце па выкананьні плянаў трэцяй бальшавіцкай вясны. Мы маем надзвычай многа ўзораў прыкладнай гераічнай работы калгасных ячэек і паасобных камсамольцаў у барацьбе за веснавую сяўбу. Камсамольскія арганізацыі зьяўляюцца застрэльшчыкамі сацыялістычнага спаборніцтва і ўдарніцтва, застрэльшчыкамі высокіх норм выпрацоўкі, прыкладных адносін да працы, да інвэнтару, машыны і каня. Калгасныя ячэйкі зараз **павярнуліся тварам да калгаснай вытворчасьці.** Пытаньне вытворчасьці стала стрыжнявой работай у калгаснай ячэйцы.

Аднак, гэта агульнае становішча не выключае сабою наяўнасьці рад адмоўных момантаў у рабоце калгасных камсамольскіх ячэек. Некаторыя ячэйкі замест сыстэматычнай выхаваўчай работы, замест садзейнасьці правільнай арганізацыі працы ў калгасе ішлі па лініі найменшага супраціўленьня, **проста займаліся неабдуманай перакідкай сваіх сіл на работу.** У адносінах перабудовы работы калгасных ячэек мы не дабіліся яшчэ патрэбных рэзультатаў. З пункту погляду арганізацыйнай структуры калгасных ячэек ЛКСМБ мы маем рад скажэньняў, якія да апошняга часу не ліквідаваны.

У канцы мая ЦК прыняў пастанову **аб расстаноўцы камсамольскіх сіл у калгасе.** Гэтай пастановай ЦК абавязаў усе арганізацыі паставіць у цэнтры сваёй увагі работу калгаснай камсамольскай ячэйкі, забясьпечыць асноўныя вучасткі камсамольскім кіраўніцтвам і ўплывам, расставіць камсамольскія сілы так, каб у кожнай брыгадзе была і рука і вока камсамольца, каб мелася камсамольскае кіраўніцтва і ўзорныя прыклады практычнай работы. У гэтых адносінах мы маем ужо некаторы зрух, але ў рабоце камсамольскай ячэйкі яшчэ няма асноўнага ўпору, асноўнай увагі вытворчай брыгадзе.

У радзе камсамольскіх ячэек некалькі аслаблена ўвага да выхаваўчай работы. Аслабленьне ўвагі да масавай работы і да некаторых упутрысаюзных пытаньняў прывяло да аслабленьня росту камсамольскай арганізацыі. Вядома, тут гутарка ідзе не аб тым бурным росьце, які быў за мінулы час, а аб тых задачах, **якія пастаўлены трэцім пленумам ЦК УсеЛКСМ у галіне росту, аб задачах, якія высунуты ў прамове тав. Постышава. Далейшы рост камсамолу павінен суправаджацца посьпехамі нашай вытворчай работы і павышэньнем выхаваўчай работы.**

Пастаўленая задача ЦК партыі аб тым, каб у кожным калгасе была камсамольская ячэйка, намі ня выканана. Па БССР толькі ў 31 проц. калгасаў ёсьць ячэйкі ЛКСМБ.

Нам неабходна выправіць усе тыя недахопы, якія ёсьць у арганізацыйнай пабудове ячэек на вёсцы. Трэба ліквідаваць усе сельскія ячэйкі, ператварыць іх у калгасныя, пабудаваць іх па вытворчым прынцыпе. Трэба забясьпечыць у бліжэйшы час правільную расстаноўку сіл. Неабходна **ў кожнай вытворчай брыгадзе арганізаваць камсамольскую групу.** Работа ў кожнай ячэйцы павінна быць пастаўлена так, каб у максымальнай меры садзейнічаць партыйнай арганізацыі ў выкананьні ўсіх вузлавых задач сацыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі. У сыстэме гэтай работы неабходна паставіць як важнейшую задачу — умацаваньне нізавога зьвяна — брыгады. Сур'ёзную ўвагу мы павінны зьвярнуць на стварэньне і ўмацаваньне апорных пунктаў саюзнай работы на вёсцы, г. зн. апорных ячэек ЛКСМБ, вылучаўшы вядучымі ў адносінах дапамогі ў рабоце вакольным ячэйкам камсамольскія ячэйкі саўгасаў, МТС і буйнейшых калгасаў. Асноўная задача гэтай дапамогі павінна заключацца ў паказе лепшых узораў сваёй работы, у перадачы лепшага вопыту шляхам пасылкі спэцыяльна-вылучаных людзей, шляхам правядзеньня сумесных сходаў і г. д.

Кажучы аб перабудове саюзнай работы па вёсцы ў адпаведнасьці з новымі ўмовамі і задачамі, аб палепшэньні зьместу масавай палітычнай работы, неабходна зьвярнуць належную ўвагу **на паляпшэньне работы саюзных сходаў.** Трэба забясьпечыць добрую падрыхтоўку да саюзнага дня як з пункту погляду падбору парадку дня, вылучэньня дакладчыка, так і вызначэньнем месца для сходу, сваячасовага абвяшчэньня аб ім і г. д. Трэба дабіцца, каб у кожнай ячэйцы саюзны дзень зьяўляўся арганізатарам разгортваньня бальшавіцкай самакрытыкі, каб гэты дзень зьяўляўся вычарпальным, здавальняючым усе тыя пытаньні, якія цікавяць і хвалююць як камсамол, так і беспартыйную моладзь. Знаходзячыся напярэдадні VII-ай усесаюзнай канфэрэнцыі камсамолу, мы павінны паставіць перад сабой задачу, каб усе ўпутрысаюзныя пытаньні ўзьняць на большую вышыню і пакіраваць вытворчую актыўнасьць камсамольцаў і працоўнай моладзі на пасьпяховае вырашэньне чарговых задач сацыялістычнага будаўніцтва.

У заключэньне свайго дакладу тав. Камароў спыняецца на пытаньні кіраўніцтва работай калгасных ячэек ЛКСМ з боку райкомаў. За час пасьля апошняга пленуму ЦК ЛКСМБ наша камсамольская арганізацыя Беларусі значна прасунулася наперад у справе ўмацаваньня канкрэтнага кіраўніцтва работай. Бліскучыя ўзоры сваёй работы і ініцыятывы паказалі за апошні час **Дрысенская і Жыткавіцкая** арганізацыі. У цэлым радзе арганізацый мы маем прыклады добрай пастаноўкі работы, здольнасьць камсамольскіх арганізацый па-бальшавіцку змагацца за ажыцьцяўленьне чарговых задач. Побач з гэтым некаторыя камсамольскія арганізацыі яшчэ канчаткова ня вызваліліся ад прыцыпаў старога кіраўніцтва, якое заключалася ў агульнасьці падыходу да кіраўніцтва калгаснай ячэйкай, у няўменьні вылучыць па паўны адрэзак часу рашаючыя зьвеньневыя пытаньні гаспадарчай і палітычнай работы, у няўменьні арганізаваць масы на барацьбу за выкананьне гэтай задачы.

У рабоце кожнага райкому камсамолу, пад кіраўніцтвам калгаснай ячэйкі, трэба рабіць упор на пізавое зьвяно, на брыгаду. Трэба забясьпечыць правільную расстаноўку камсамольскіх сіл у калгасах і ў максымальнай меры ўзмацніць разгортваньне масавай палітычнай работы ня толькі вакол пастаноў партыі і ўраду, ня толькі па лініі барацьбы за прамфінплян, за сяўбу, за ўборку, але і вакол кожнай дробнай справы, якая намячаецца ячэйкай для правядзеньня ў жыцьцё.

Мы гэтым самым забясьпечым яшчэ большае павышэньне актыўнасьці камсамольскай арганізацыі ў вёсцы ў барацьбе за выкананьне палітычных і гаспадарчых задач, якія пастаўлены партыяй.

Выкараніць бруд

БАБРУЙСК.

Каб ацаніць справу грамадзкага харчаваньня на бабруйскім дрэваапрацоўчым заводзе, дзе ганята 5.000 рабочых, карысна прывесьці некаторыя вытрымкі з акту, складзенага санітарным доктарам, які зглядаў сталоўку-разьмеркавальнік. Трэба адзначыць, што гэты разьмеркавальнік забясьпечвае гарачай стравай усе цэхі камбінату. Вось вытрымкі: «Уборка кухні вытвараецца надбайна, сьцены прымыцьці забрызгваюцца брудам. Катлы і іх накрышкі, чарпакі, мяшалкі — пакрыты брудам.

Ручнікоў на кухні няма і работнікі выціраюць рукі спэцвопраткай».

— «Абеды даволі часта адпускаюцца ў талерках з рэшткамі папярэдніх абедаў».

— «Графінаў на сталох мала і часта яны пустыя».

— «Рабочыя вымушаны піць сырую ваду».

— «У падсобных памяшканьнях мяса знаходзіцца ў брудных скрынях без крышак».

Абеды кухня выдае ня ў поўнай меры. 29 мая фанэрнаму заводу кухня недадала 20 абедаў і 20 чалавек пакінулі працу з паловы дня.

Немагчыма знайсьці іншае, больш прыгожае памяшканьне — адказваюць кіраўнікі. Ну, добра. А пліты адрамантаваць, падмазаць, каб яны ня дымілі — можна?

А пачысьціць на кухні, каб ня было брудна, апрануць кухароў у адпаведную спэцвопратку — можна? Ну, а пасылаць у цэхавыя сталоўкі страву ў чыстых тэрмасох, у патрэбнай колькасьці, каб хапіла ўсім рабочым — можна?

Можна-ж гэта зрабіць, таварышы Ворынаў і Довін — старшыня Саапхарчу і загадчык сталоўкі - разьмеркавальніка.

Санітарным становішчам сталоўкі бабруйскага дрэваапрацоўчага камбінату павінна неадкладна заняцца райКК-РСІ. Трэба вытруціць бруд і разам з тым тых гора-работнікаў, якія прывыклі да антысанітары.

М — д.



ПАНАРАМА ЧАЛЯБІНСКАГА ТРАКТАРНАГА ЗАВОДУ—НОВАГА ГІГАНТА САВЕЦКАЙ ІНДУСТРЫІ, ЯКІ 1 СТУДЗЕНЯ 1933 Г. УВОЙДЗЕ Ў СТРОЙ ПРАЦУЮЧЫХ ПРАДПРЫЕМСТВАЎ.

Дэманстрацыйны гэст вялікадзяржаўнага шавініста

Дзесяткі новых фабрык і заводаў, саўгасаў, тысячы калгасаў, дзесяткі вышэйшых навучальных устаноў, сотні тэхнікумаў, шырокая сетка сямігодак, рад навукова-дасьледчых устаноў, разьвіцьцё пралетарскай літаратуры і ўсіх відаў мастацтва — вынік барацьбы КП(б)Б за ажыцьцяўленьне ленінскай нацыянальнай палітыкі.

Ухіл у бок вялікадзяржаўнага шавінізму «адлюстроўвае імкненьні аджываючых клясаў папаваўшай раней вялікарускай нацыі вярнуць сабе страчаныя прывілеі». (Сталін).

Задача кожнай партыйнай ячэйкі мабілізаваць сябе на барацьбу з ухілам да вялікадзяржаўнага шавінізму.

Мы ў гэтай заметцы хочам расказаць аб адным абураючым факце праяўленьня вялікадзяржаўнага шавінізму з боку работніка савецкай установы.

Белпладагароднінна дасылае ў свае раённыя пункты ўсе матар'ялы на беларускай мове. Гэтым абуран **Паліцкі.** І калі яго абурэньне дайшло да краёў, ён піша:

«Минск, Белплодогороднина.

Несколько раз я вам писал насчет В-бумажек, вы посылаете нам ежедневно бумажки и мы их не можем разобрать, **у нас на пункте в Лельчицах белорусских счетоводов и деловодов не имеется.** Если вам наши бумажки и пятидневные сводки неугодны, то вы пришлите нам из Минска счетовода и деловода по Вашему вкусу. **Я категорически отказываюсь от выполнения ответами на В-бумажки, поскольку мы их не понимаем по-белорусски.**

. . . . . .

Зав. Лельчицкого пункта БПОвощь **ПАЛИЦКИЙ».** *)

Патрабаваньне **Паліцкага** кароткае і катэгарычнае. Ці-ж патрэбны тут дадатковыя даныя? Хіба-ж бяз іх ня ясна, каму служыць гэта чорнасоценна-шавіністычная вылазка чыноўніка. Хіба-ж ня ясна, што гэта ахвосьце буржуазнага нацыяналізму сваім дэманстрацыйным гэстам адкрыта і на хабна выступае супроць ленінскай нацыянальнай палітыкі партыі

Шавініст Паліцкі ня можа мірыцца з тым, што былая «адзіная і непадзельная» ў рэзультаце Кастрычніцкай рэвалюцыі прадстаўляе сабою Саюз Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік, у якім пралетары, калгаснікі і працоўныя ўсіх нацыянальнасьцяй, пад кіраўніцтвам партыі, будуюць сацыялізм. Клясавая нянавісьць—вось што выклікала ў шавініста нахабную вылазку супроць нацыянальнай палітыкі партыі, супроць беларусізацыі.

Гэст лельчыцкага Паліцкага—знаёмы. Ён, як дзьве кроплі вады, падобны на антысавецкія гэсты полацкага **Пшчолкі,** жыткавіцкага **Чудзіна,** гарачоўскай **Засімавай.**

Усе яны, аказваючы актыўнае і пасыўнае супраціўленьне беларусізацыі, з нагардай адносячыся да раней прыгнечанай нацыі, ня бачаць і ня хочуць бачыць таго, што шматмільённы народ—пралетарыят і працоўныя масы сялянства БССР, пад кіраўніцтвам КП(б)Б, пры брацкай дапамозе пралетарыяту саюзных рэспублік, разьвіваюць эканоміку сваёй рэспублікі, сваю культуру, нацыянальную па форме і сацыялістычную па зьместу.

Ліст Паліцкага — адкрытая і нахабная вылазка вялікадзяржаўнага шавініста. Яна патрабуе да сябе ўвагі ўсіх партарганізацый і шырокай пралетарскай грамадзкасьці.

Гэта вылазка гаворыць і аб другім. Самы факт зьяўленьня ліста ў некаторай ступені пралівае сьвятло на становішча работы па ажыцьцяўленьні ленінскай нацыянальнай палітыкі, па правядзеньні беларусізацыі ў Лельчыцкім раёне.

Лельчыцкая партарганізацыя, мабілізаваўшы сваю ўвагу вакол гэтага канкрэтнага факту, павінна **праверыць усе свае зьвеньні** і прыводныя пасы, як яны змагаюцца за ленінскую нацыянальную палітыку, за беларусізацыю, за карэнізацыю апарату. Задача партарганізацыі — узмацніць барацьбу з ухіламі ад ленінскай нацыянальнай палітыкі, супроць галоўнай небясьпекі—ухілу да вялікадзяржаўнага шавінізму; супроць ухілаў да напыяналізмаў беларускага, яўрэйскага, польскага і іншых.

Ал. Карачун.

*) Стыль аўтара захаваны. Падкрэсьлена намі.

Не дапусьціць паўтарэньня шкоднай бюракратычнай гульні

(Ліст рабочых)

Наш дражджавы завод **«Чырвоная зорка» (Менск)** па колькасьці прадукцыі, якая выпускаецца ім, займае другое месца ў Савецкім саюзе. Ад работы нашага заводу ў значнай меры залежыць хлебапячэньне Іванава-Вазьнясенскай вобласьці, Самары, Сталінграду і іншых прамысловых цэнтраў СССР.

Рабочы калектыў заводу разумее адказнасьць тэй задачы, пад вырашэньнем якой ён працуе і пад кіраўніцтвам сваёй партарганізацыі ўсё аддае для таго, каб у тэрмін выканаць прамфінплян заводу.

У апошні час наша прадпрыемства перавыканала сваё вытворчае заданьне. Напрыклад, за першую дэкаду чэрвеня мы перавыканалі прамфінплян на 14 проц., а вось у другой дэкадзе чэрвеня малюнак зьмяніўся. Завод працаваў з перабоямі. Плян сарваўся. І чаму? Таму, што ня было тары для ўпакоўкі дрожджаў, таму, што ў нас на прадпрыемстве адсутнічалі дошчачкі, якія робяцца з браканаванай фанэры.

Хто-ж вінават у гэтым?

14 чэрвеня тав. Багдановіч—рабочы нашага заводу—быў камандыраваны на **Бабруйскі фанэрны завод № 16** для атрыманьня поўфабрыкатаў на тару. Выпікаў ад камандыроўкі Багдановіча ніяк. Кіраўніцтва заводу № 16 фанэры не адпусьціла, матывуючы тым, што «нам дрожджы не патрэбны». Багдановіч прымушан быў паехаць за дапамогай у Менск. Там ён атрымаў ад упаўнаважанага Фанэртрэсту тав. Гулёва належнае пісьмовае распараджэньне на імя дырэктара заводу № 16 і накіраваўся з гэтым у Бабруйск.

Адначасова тав. Гулёў паслаў у Бабруйск тэлеграму-маланку, на якой быў, між іншым, подпіс памочніка дырэктара заводу № 16 тав. Шапіра. Апошні ў гэты час быў у Менску. Апрача таго Шапіра аддаў належнае распараджэньне заводу па тэлефону.

Аднак, ні пісьмовае распараджэньне трэсту, ні тэлеграмы, ні размовы па тэлефону не зрабілі ўплыву. Яны ўпэўнэнт разьбіваліся аб бюракратызм аднаго з кіруючых работнікаў заводу **Кацнэльсона** і загадчыка складу гэтага прадпрыемства **Аса.**

— Нам дрожджаў не патрэбна, фанэры не дамо і скончана.

12 дзён рабочы «Чырвонай зоркі» прасядзеў у Бабруйску. І толькі 24 чэрвеня яму адпусьцілі 6 кбм. фанэры, якое для заводу хопіць ня больш, як на 5-6 дзён.

Бюракраты і валакітчыкі з заводу № 16 «пайшлі на ўступкі». Але за сваё «адступленьне» яны паважыліся адпомсьціцца. Бухгальтэрыя заводу чамусьці не захацела скарыстаць пры дапамозе банку безнаяўнага разрахунку і патрабавала ад Багдановіча наяўнымі. У тав. Аса рантам не аказалася шпагату для ўпакоўкі 6 кбм. фанэры, а на складзе ўпаковачнага матар'ял быў.

Усё гэта прывяло да таго, што «Чырвоная зорка» прымушана была на адзін дзень (22 чэрвеня) спыніць работу.

Мы ня можам пакінуць бяз увагі той факт, што паасобныя кіруючыя работнікі зацікаўленых у гэтай справе цэнтральных устаноў не знайшлі часу для таго, каб забясьпечыць фанэрай «Чырвоную зорку». Да такіх «вельмі занятых» асоб адносіцца загадчык плянавага сэктару Наркамснабу тав. **Касьцевіч.**

Мы лічым, што **Наркамснаб, Белбрадаб'яднаньне, Фанэртрэст** і іншыя ўстановы павінны больш аддаваць увагі нашаму заводу, каб ня зрываць прамфінплян. А гэтай увагі няма. Вось ужо пачынаецца трэці квартал, а пароду на фанэру «Чырвоная зорка» яшчэ ня мае.

Нельга дапусьціць, каб зноў паўтарылася шкодная бюракратычная гульня, якая толькі за адну дэкаду чэрвеня прынесла дзяржаве дзесяткі тысяч руб. страт.

Рабочыя заводу «ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА» — Бергер, Сарокіна, Марачоў, Шапіра, Вайнэр.

Старшыня калгасу—кулацкі агент

(Ліст студэнта-тысячніка)

Яшчэ з 1929 г., г. зн. з першых дзён заснаваньня калгасу **«Шлях Леніна» (Крупскі раён, Б.-Хаўневіцкага сельсавету)** ў ім знайшла сабе прытулак кулацкая група. У яе ўваходзілі **Кулікоўскія Андрэй і Мікалай, Сьляцкі і Хрыпач Вікенці.** На чале-ж калгасу стаяў блізкі **сваяк кулака Кулікоўскага—Баркоўскі.**

Адным словам, кампанія сабралася цёплая: кулакі падрывалі работу калгасу, а Баркоўскі рабіў выгляд, што ён гэтага не заўважвае.

Мне давялося некалькі раз напісаць аб гэтым у **«Праўду»** і **«Зьвязду».** Сыгналы былі пачуты і ў рэзультаце сапраўдны твар гэтых «калгасьнікаў» быў выкрыт. Кулакоў выслалі. Але-ж у калгасе застаўся іх сваяк і прыяцель Баркоўскі, які і па гэты дзень трымае з высланымі кулакамі пісьмовую сувязь і танцуе пад іх дыктоўку.

Прыведу некалькі фактаў. Ня гледзячы на тое, што ў калгасе не хапае цягавай сілы, Баркоўскі застраліў чэцьвера калгасных коняй і ў гэты-ж час за калгаснае жыта купіў 2 коняй ад спэкулянтаў. Скуры застрэленых коняй ён схаваў у былой кулацкай сушні, дзе яны былі знойдзены калгаснікамі, але ўжо гнілымі.

Некалькі калгасьнікаў доўгі час працавалі на адыходніцтве ў саўгасе «Яноўчына». За сваю працу яны атрымалі толькі па 10 руб. грашыма, а рэшту заработку натурай атрымаў для сваіх уласных патрэб Баркоўскі.

У калгас «Шлях Леніна» ўступілі з іншых вёсак Шарноўскія Віктар і Артур і Багдановіч Казімір. Свае хаты яны прадалі і пераселіліся ў будынкі выселеных кулакоў у калгасе «Шлях Леніна». Грэшы за праданыя хаты гэтых калгасьнікаў забраў сабе Баркоўскі і ня даў ніякай расьпіскі, матывуючы тым, што гэтыя грошы будуць унесены ў фонд калгасу, **як арэндная плата** за карыстаньне былымі кулацкімі будынкамі.

У той час, як для сваіх прыяцеляў у Баркоўскага ёсьць калгасны хлеб, то для тых калгасьнікаў, якія крытыкуюць яго ўчынкі, хлеба ў калгасе няма. Напрыклад, ён адмаўляецца даць хлеба калгасьніку Хрыпачу Івану, майму бацьку, толькі таму, што:

— У цябе ёсьць сыны, якія вельмі добра ўмеюць пісаць у газэты. Няхай яны і выпішуць табе хлеб.

Сын Баркоўскага займае пасаду рахункавода калгасу, што дае магчымасьць старшыні калгасу—таму-ж Баркоўскаму—так весьці калгаснае рахункаводзтва, каб ня можна было выкрыць самазабесьпячэньня.

Аб усім гэтым добра ведае старшыня сельсавету **Сас.** Але ён маўчыць і ніякіх захадаў ня прымае. Тлумачыцца гэта тым, што Сас зьяўляецца блізкім сваяком Баркоўскага і разам з сакратаром партыйнай ячэйкі Чубурда прымае ўдзел у папойках, якія арганізоўвае Баркоўскі.

Ці доўга так будзе?

Хрыпач.

Калі-ж будзе дана дапамога?

(Ліст чырвонаармейца)

У пастановах ураду ясна сказана, якімі ільготамі карыстаецца сям'я чырвонаармейца. Але ёсьць выпадкі, калі мясцовая ўлада бюракратычна падыходзіць да задавальненьня правоў чырвонаармейца.

Мая жонка **Гаворчанка Парасковія,** якая зараз знаходзіцца ў калгасе **«Іскра сацыялізму», Рагачоўскага раёну, М.-Стралкоўскага сельсавету,** у гэтага часу не атрымала дапамогі, **што ёй належыць.**

Я пытаю ў старшыні М.-Стралкоўскага сельсавету і Рагачоўскага РВК калі-ж нарэшце яны выдадуць ёй дапамогу?

Гаворчанка.

АД РЭДАКЦЫІ: «Зьвязда» звяртае ўвагу **Рагачоўскай КК-РСІ** на факт **бяздушна-бюракратычных адносін Рагачоўскага РВК і М.-Стралкоўскага сельсавету** да справы выдачы **дапамогі сям'і чырвонаармейца.**

Арганізаваць водпуск малака

У Менску для дзяцей працоўных адпускаецца малако. Адпускаюць, пу і добра, думаюць у МЦРК і гарснабе. Іх не хвалюе чарга каля магазыну, што зьяўляецца з 6 гадзін раніцы.

Для таго, каб атрымаць паўлітра малака, патрэбна патраціць амаль цэлы дзень. Асабліва дрэнна таму, хто жыве далёка і не займае месца ў чарзе з самай раніцы. Ён нярэдка, змарнаваўшы дарагі час, варочаецца з пустымі рукамі.

Зусім інакш было-б, каб малако давалі там, дзе даюць хлеб, ці адкрылі больш крам.

Трэба, каб МЦРК і гарснаб сур'ёзна заняліся ўрэгуляваньнем справы водпуску малака.

Лісоўскі.

„Усушаны" абед

(Ліст курсанта)

Абеды ў нашай сталоўцы пастолькі пагоршваюцца, наколькі расьце іх цана.

Мы атрымліваем прадукты па 1-ай катэгорыі. Але-ж да курсанта абед даходзіць са значнай «усушкай». Напрыклад, хлеба нам належыць 150 грам, а даюць толькі 100 гр. Праўда, абед будзе важыць значна больш, усушку прадуктаў тут **кампэнсуюць вадой.**

Прадукты гэтай сталоўцы адпускаюцца толькі для курсантаў, а скарыстоўваюць наш паёк каму толькі ахвота. Служачыя, іх дзеці, выпадковыя «госьці», а больш за ўсё адміністрацыя сталоўкі. **Уліку няма. Адкуль і куды ідзе прадукт—нямаведама.**

Апрача прадуктаў яшчэ «плачуць» і нашы грошы. Напрыклад, выяўлена, што не правезена па кнігах **2.167 руб.**

Скаргі-ж курсантаў застаюцца без увагі.

Менск, курсы «Чырвоных дырэктароў» **Курсант.**

АД РЭДАКЦЫІ: «Зьвязда» чакае ад трэсту грамадзкага харчаваньня паведамленьня аб прынятых захадах па гэтым лісьце курсанта.

Месячнік штурму бездарожжа

СТАРАДАРОСКІ І КРУПСКІ РАЁНЫ ЗАВАЁЎВАЮЦЬ ПЕРАДАВОЕ МЕСЦА

ЧЫРВОНАЯ ДОШКА

За баявое выкананьне плянаў дарожнага будаўніцтва дадаткова заносім на чырвоную дошку:

Капыльскі раён—плян выхаду рабочай сілы за тры пяцідзённі месячніка выканаў на 40,8 проц., фурманак—на 8,25 проц.

Заслаўскі раён—адпаведна 35,16 проц. і 6,9 проц.

ЧОРНАЯ ДОШКА

За невыстарчальныя тэмпы правядзеньня месячніка дарожнага будаўніцтва, за адсутнасьць бальшавіцкай мабілізацыі мас пакідаем на чорнай дошцы:

Нараўлянскі раён—за тры пяцідзённі месячніка выканаў плян выхаду фурманак на 1,9 і рабсілы —на 12,25 проц.

Лагойскі адпаведна—11,3 проц. і 13,6 проц.

Лёзьнянскі—18,9 проц. і 10,3 проц.

Дадаткова заносім на чорную дошку:

Рэчыцкі раён—за тры пяцідзённі месячніка выканаў плян выхаду фурманак на 0,58 проц., рабсілы—0,69 проц.

Клічаўскі адпаведна—0,8 і 0,9 проц.

Бягомльскі—1,0 проц. і 1,5 проц.

Дрысенскі—1,9 проц. і 1,4 проц.

Горацкі—4,0 проц. і 1,7 проц.

Чэрвеньскі—4,6 проц. і 1,2 проц.

Слуцкі—4 проц. і 6 проц.

Ня менш 60 проц. гадавога пляну

За 15 дзён месячніка дарожнага будаўніцтва па 42 раёнах месячны плян выхаду фурманак выканан на 27 проц. і рабсілы — каля 20 проц. У адносінах-жа да гадавога пляну выкананьне адпаведна складае 6,5 проц і 9,5 проц.

Лічбы сыгналізуюць аб простай пагрозе зрыву дарбудаўніцтва. На прачыту месячніка павінна быць выканана ня менш 60 проц. гадавога пляну. Вынікі-ж першай паловы месячніка не даюць гэтаму ніякай гарантыі. Такія нізкія тэмпы зьяўляюцца нічым іншым, як вынікам апартуністычнай педаацэнкі дарбудаўніцтва, нежаданьня працаваць па-бальшавіцку, спадзяваньня на самацёк, адсутнасьці мабілізацыі мас вакол пляну месячніка.

Толькі гэтым можа тлумачыць тое, што **Лагойскі, Нараўлянскі і Лёзьнянскі** раёны, якія былі занесены 25 чэрвеня «Зьвяздой» на чорную дошку, яшчэ не дабіліся пералому ў рабоце, не заваявалі права быць зьнятымі з чорнай дошкі. Толькі гэтым можна тлумачыць і тое, што рад раёнаў **(Гомельскі, Магілеўскі, Віцебскі, Шклоўскі** і інш.) абвясьцілі месячнік са спазьненьнем на 5-15 дзён і то не забясьпечылі бальшавіцкага яго разгортваньня.

Асобна трэба адзначыць **Дрысенскі** раён, які сёньня занесен «Зьвяздой» на чорную дошку. Гэты раён не замацаваў перадавога месца, якое было заваявана ў месячніку падрыхтоўкі да дарбудаўніцтва, што праводзіўся ў лютым-сакавіку. Тады раён паказваў бліскучыя ўзоры барацьбы за плян, ішоў першым у БССР, за што рад работнікаў калгасаў, вёсак і ўдарнікаў былі прэміяваны.

Як і ў першай пяцідзённі па-раней шаму ідуць упередзе занесеныя 25-га чэрвеня «Зьвяздой» на чырвоную дошку **Стара-Дароскі раён** (выканаў плян за тры пяцідзённі месячніка па выхадзе фурманак на 57,3 проц. і рабсілы —67,9%) і **Крупскі** раён (адпаведна 41,6 проц. і 57,1 проц.). Бальшавіцкая мабілізацыя мас, апэрацыйнае кіраўніцтва, шырокае разгортваньне сац спаборніцтва і ўдарніцтва далі ім магчымасьць выйсьці на перадавое месца.

Па Стара-Дароскім і Крупскім раёнах павінны раўняцца ўсе раёны БССР. Далейшае адтаваньне пецярпіма. Усе магчымасьці для поўнага выкананьня пляну ёсьць. Дні, што засталіся да канца месячніка, павінны стаць сапраўды штурмовымі. Прапушчанае трэба неадкладна нагнаць.

Да ўвагі трэсту грамадзкага харчаваньня

(Ліст настаўніка)

Шмат вынесена пастаноў аб **паляпшэньні дабрабыту настаўніцтва.** Толькі ня ўсюды яны выконваюцца. Узяць хоць-бы нашу **сталовую № 74.** Абеды дрэнныя і дарагія таму, што ў сталоўцы пануе безгаспадарчасьць і безадказнасьць.

Уведзен гаспадарчы разрахунак. Але ён праводзіцца няўмела і станоўчых вынікаў не дае.

Трэст грамадзкага харчаваньня, зьвярні ўвагу на сталовую **№ 74.** Пастановы партыі патрабуюць сапраўднага паляпшэньня бытавых умоў настаўніцтва.

Менск. Взгман.

Цяляшаўскія сельсаветчыкі адмініструюць

(Ліст калгасьніка)

Атрыманы плян мясазагатовак на другі квартал бягучага году **Цяляшаўскім** сельсаветам, **Уваравіцкага** раёну, быў толькі абгаворан на пасяджэньні прэзыдыуму сельсавету, дзе гэты плян разьмеркавалі па населеных пунктах. Пасьля разьмеркаваньня кожнаму члену сельсавету былі накіраваны адносіны з паказаньнем тэй колькасьці мяса, якая павінна быць загатоўлена ў тым ці іншым населеным пункце.

Атрымаўшы гэтыя адносіны, члены сельсавету разам з камісіямі садзейнасьці разьмеркавалі лічбы загатовак паміж асобнымі гаспадаркамі і **давялі іх да кожнага двара.**

Такі мэтад правядзеньня загатовак у Цяляшаўскім сельсавеце ўжываецца заўсёды. Работнікі сельсавету ня лічаць патрэбным разгарнуць масавую работу сярод калгасьнікаў і працоўных аднаасобнікаў, растлумачыць ім значэньне таго ці іншага мерапрыемства. Яны прывыклі дзейнічаць адміністрацыйна.

Калі-ж запытаеш у сакратара партыйнай ячэйкі тав. **Паддубнага** — чаму ўжываюцца ў сельсавеце такія мэтады работы, ён адказвае:

— Даволі ўжо нам агітаваць дзядзькоў. Яны і самі добра ведаюць, што такое загатоўкі.

Уваравіцкі РВК павінен зьвярнуць на гэта ўвагу і навучыць Цяляшаўскіх сельсаветчыкаў, як трэба працаваць.

Калгасьнік.

ЗА МЯЖОЙ

АРЫШТ КАМУНІСТЫЧНАГА КАНДЫДАТА Ў ПРЭЗЫДЭНТЫ ФОСТЭРА

Прадвыбарчы тэрор у Амэрыцы

НЮ-ЕРК, 28. 27 чэрвеня паліцыя г. Лёс-Анжэлос (Каліфорнія) арыштавала камуністычнага кандыдата ў прэзыдэнта Фостэра па абвінавачваньні яго ў «злачынным сындыкалізьме». Фостэр быў арыштаваны ў часе кіраўніцтва дэманстрацыяй пратэсту ў некалькі тысяч рабочых супроць налёту паліцыі на сходы беспрацоўных, калі паліцэйскімі быў паранен адзін рабочы. На цэнтральным пляцы Лёс-Анжэлос некалькі соцень да зубоў узброеных паліцэйскіх напалі на дэманстрацыю. Шмат рабочых было забіта і паранена. Апрача Фостэра былі арыштаваны яшчэ 5 чал. Рабочыя мужна супраціўляліся, але вымушаны былі спыніць дэманстрацыю, калі паліцыя стала кідаць бомбы, што выклікаюць сьлёзацячэньне.

28 чэрвеня раніцою цэнтральны пляц гораду абярнуўся ва ўзброены лягер, дзе было сканцэнтравана 500 паліцэйскіх і 600 узброеных членаў рэакцыйнага «амэрыканскага легіёну». Ня гледзячы на гэта, рабочыя зноў дэманстравалі на пляцы ў знак пратэсту супроць паліцэйскага тэрору.

Паліцэйскі тэрор у Лёс-Анжэлосе прымушае кампартыю і іншыя рэвалюцыйныя арганізацыі перайсьці на нелегальнае існаваньне. Паліцыя ня раз рабіла налёты на штаб-кватэры рабочых арганізацый і на дамы, дзе жывуць камуністы. Арыштавана шмат камуністаў і рэвалюцыйных рабочых. За апошнія некалькі дзён паліцыя забараніла прадвыбарчыя мітынгі, арганізаваныя кампартыяй і адмовілася прадаставіць Фостэру памяшканьне грамадзкага сходу для прадвыбарчага выступленьня ад імя кампартыі.

12 чэрвеня ў дзень міжнароднай салідарнасьці мільёны працоўных Германіі і іншых капіталістычных краін дэманстравалі сваю гатоўнасьць да барацьбы супроць фашызму, імпэрыялістычнай вайны і голаду. Па ўсёй Германіі адбыліся сотні масавых сходаў і мітынгаў. Так. У БЭРЛІНЕ было праведзена 15 сходаў Міжрабпому, на якіх прысутнічала каля 250 ТЫС. РАБОЧЫХ.

У ТУРЫНГІІ адбыўся 61 мітынг салідарнасьці. У САКСОНІІ было праведзена 64 мітынгі. З асаблівым уздымам прайшоў дзень міжнароднай салідарнасьці ў РУРСКАЙ ВОБЛАСЬЦІ І ГАМБУРГУ.

НА ЗДЫМКУ: Рабочыя-фізкультурнікі ідуць у Карльсгоф на мітынг. У авангардзе Вілі Мюнцэнбэрг, генэральны сакратар Міжрабпому, гаворыць прамову ў Карльсгофе.

ВУЛІЧНЫЯ БАІ ПАМІЖ СЯЛЯНАМІ І ПАЛІЦЫЯЙ У ГЕРМАНІІ

БЭРЛІН, 29. Учора ў вёсцы Гебрыхэн каля Плёрцгейну адбываліся сапраўдныя вулічныя баі паміж даведзенымі да роспачы сялянамі і паліцыяй. Повадам да баёў паслужыў продаж маемасьці аднаго бедняка. Пабудаваўшы барыкады на галоўнай вуліцы, сяляне прабавалі аказаць супраціў леньне паліцыі. Паліцэйскія адкрылі агонь і забілі аднаго селяніна і сялянку. Некалькі сялян арыштавана. Увечары ў вёску прыбыў вялікі атрад паліцыі. Сяляне забарыкадавалі ўезд у вёску вазамі з сенам, праз якія паліцэйскія пачалі страляць з вінтовак. Сяляне са свайго боку бамбардыравалі паліцыю каменьнямі. Паліцэйскія стралялі ўздоўж усёй галоўнай вуліцы вёскі і ў асобныя сялянскія двары. З вялікім трудом паліцыі ўдалося ўвесьці з сабой арыштаваных сялян. Вёска поўна жандармэрыі. (ТАСС).

Арышты рэвалюцыйных рабочых у Японіі

ТОКІЁ, 28. (ТАСС). Згодна паведамленьня газэты «Асахі» такійскай паліцыяй у пачатку чэрвеня былі арыштаваны 23 рабочыя па абвінавачаньні ў тым, што яны зьяўляюцца кіраўнікамі рэвалюцыйнай прафапазыцыі такійскага саюзу транспартнікаў. Прафапазыцыя, па словах газэты, разгарнула пад кіраўніцтвам кампартыі вялікую работу. 26 чэрвеня паліцыя зноў арыштавала некалькі членаў рэвалюцыйнай прафапазыцыі. Арышты працягваюцца.

Выбух аднаго з буйнейшых парахавых заводаў у Японіі

ТОКІЁ, 29. 28 чэрвеня выбухам разбуран дашчэнту ў горадзе Нока (прафэктура Міогафі) адзін з двух буйнейшых парахавых заводаў у Японіі. Выбухі пачаліся ў нітра-гліцэрынавым аддзяленьні заводу. (ТАСС).

8-мы выпуск Беларускага Дзяржаўнага Унівэрсытэту

ЦК КП(б)Б, СНК, ЦВК, ЦСПСБ, НКА

Рапарт

Беларускі Дзяржаўны Унівэрсытэт, выпускаючы 92 чырвоных спэцыялістаў у галіне фізыка-матэматычных і прыродазнаўчых навук і падрыхтаваных для сябе праз свой рабфак 38 студэнтаў, кладзе новы рад цаглін на вялізарную пабудову сацыялізму ў краіне Саветаў.

Выпускнікі унівэрсытэту, узброеныя марксыцка-ленінскай мэтадалёгіяй, з шырокімі грамадзкімі, палітычнымі ведамі, з грунтоўнымі ведамі па сваёй спэцыяльнасьці дапамогуць краіне Саветаў ажыцьцявіць вялікі лёзунг нашай партыі «дагнаць і перагнаць».

Выканаць свае складаныя і адказныя задачы унівэрсытэт змог толькі дзякуючы таму, што ўсю сваю працу ён вёў пад кіраўніцтвам партыі, разгортваючы сацыялістычныя мэтады працы—сацспаборніцтва і ўдарніцтва, змагаючыся на два фронты ў навукова-педагагічнай рабоце. Шэсьць гістарычных ўмоў тав. Сталіна зьяўляліся штодзённай праграмай дзеяньня унівэрсытэту.

Унівэрсытэт абяцае і надалей з бальшавіцкай упартасьцю змагацца за генэральную лінію партыі, за падрыхтоўку пралетарскіх кадраў, за сацыялістычныя мэтады работы, за партыйнасьць у навуцы, за сацыялістычнае выхаваньне працоўных мас.

Няхай жыве камуністычная партыя—кіраўнік сацыялістычнага будаўніцтва.

Рэктар БДУ **Ермаковуў.**
Сакратар парткалектыву **Руткоўскі.**
Старшыня прафкому **Куляшоў.**

Вынікі навучальнага году рабфаку БДУ

Рабфак БДУ падрыхтоўвае рабоча-калгасную моладзь у ВНУ. Сярод студэнтаў рабфаку 88 проц. рабочых ад вярштату са стажам ад 3 да 25 год і 12 проц. калгасна-батрацка-сераднякцкай моладзі.

Уся праца рабфаку на працягу мінулага году праходзіла ў напрамку выкананьня пастаноў ЦК УсесКП(б) і ЦК КП(б)Б аб пачатковай і сярэдняй школе. У гэтай рабоце мы маем значныя дасягненьні.

Навучальны плян па большасьці прадметаў выкананы на 100 проц. за выключэньнем пязначнай часткі іх, на якіх навучальны плян недавыкананы на 3—10 проц. з прычыны позьняга прызначэньня выкладчыкаў.

Барацьба за марксыцка-ленінскую мэтадалёгію зьяўлялася адным з асноўных момантаў у рабоце ўсяго студэнцкага і выкладчыцкага калектыву рабфаку. З мэтай павышэньня кваліфікацыі выкладчыкаў і дапамогі ім у аўладаньні марксыцка-ленінскай мэтадалёгіяй працавалу амаль на працягу ўсяго году марксыцка-ленінскі гурток.

Значны зрух ёсьць у галіне правядзеньня палітэхнізацыі. Групы 2 курсу адбывалі дэкадную практыку на заводах: «Дрэваапрацоўшчык» і «Полымя рэвалюцыі», а студэнты 1-га курсу ў калгасе «Вольная праца». Перад практыкай на прадпрыемствах і ў калгасах распрацоўваўся тэарытычны курс палітэхнічнага цыклю. Частка выкладчыкаў са сваёй работай на прадпрыемствах са студэнтамі ў часе іх працы на вытворчасьці цесна ўвязвала тэорыю з практыкай. Праведзена экскурсія ў прамысловыя цэнтры СССР труп, якія зараз перадаюцца ў БДУ.

Правядзеньнем дыфэрэнцыяцыі стыпэндыі зьнішчана ўраўнілаўка ў матар'яльным забесьпячэньні студэнцтва.

Рабфак у сваёй працы мае яшчэ значныя недахопы Некаторая частка студэнтаў і нават паасобныя таварышы з актыву не зразумелі палітычнай важнасьці падрыхтоўкі пэдагагічных кадраў і рознымі шляхамі імкнуцца ўхіліцца ад пераводу ў БДУ.

Сёньня рабфак перадае БДУ 32 студэнтаў, якія скончылі курс навучаньня на рабфаку і 4 — у БАН. Усяго скончыла рабфак 38 асоб. За ўвесь час існаваньня рабфаку 887 рабочых ад вярштату атрымалі сярэднюю асьвету і пайшлі ў БДУ, а таксама ВНУ і ВТНУ БССР і інш. савецкіх рэспублік.

Складаючы асноўнае пралетарскае ядро, студэнты рабфаку перанясуць у БДУ і шырэй разгорнуць сацыялістычныя навыкі працы, якія набылі на вытворчасьці і замацавалі на вучобе.

Зараз перад усім калектывам рабфаку стаіць адказная задача — укамплектаваць пралетарскім ядром групы асьпіранта набору. Усяго да 1 кастрычніка неабходна прыняць 280 студэнтаў на дзенны сэктар, з іх па беларускае аддзяленьне — 210, на яўрэйскае — 35 і польскае — 35. На вячэрні сэктар неабходна залічыць 420 асоб, з якіх на беларускае аддзяленьне 350 асоб і яўрэйскае — 70. Перад намі стаіць задача — разгарнуць шырокую растлумачальную работу сярод рабочых і рабочай моладзі прадпрыемстваў, а таксама сярод калгасьнікаў па пытаньні ўкамплектаваньня рабфаку і арганізаваць жадаючым паступіць належную дапамогу.

Рамановіч.

„ЗЬВЯЗДА", радыёгазэта „За бальшавіцкія тэмпы" і цэнтральны штаб па правядзеньні месячніка дарожнага будаўніцтва арганізуюць 5-га ліпеня, у 6 гадзін вечара

РАДЫЁПЕРАКЛІЧКУ РАЙШТАБАЎ

па пытаньні ходу месячніка дарбудаўніцтва

Парадак пераклічкі наступны:

Уступнае слова ад цэнтральнага штабу—тав. ФРУМКІНА.

Інфармацыі: Менскага гарадзкога штабу, Барысаўскага, Лепельскага, Смалявіцкага, Віцебскага, Полацкага, Слуцкага Рэчыцкага, Мазырскага і Пухавіцкага райштабаў

„Зьвязда"
„За бальшавіцкія тэмпы"
Цэнтральны штаб па правядзеньні месячніка дарбудаўніцтва.

Летні тэатр сада „ПРАФІНТЭРН"
Ад 1-га ліпеня 3-ці ЦЫКЛЬ эстрадна-цырковых паказаў
МЮЗІК-ХОЛ у 2-х аддз.
У СКЛАДЗЕ:
заслужаный артыстка Рэспублікі Н. І. Комароўская
артыста Дзяржэтэтраў А. Н. Доўжанскага
(чытка ўрыўкаў клясычных твораў).
1-ы ў СССР аркестр Гусьляроў у складзе 10 асоб (граюць на розных дайніх расійскіх інструмэнтах)
ЛЕПШЫЯ ТАНЦОРЫ
Сергеева і Таскіна (танец атракцыён „зьмяя".
Вядомая сьпявачка сьпеваў народаў асьцяй Я. Л. Шчэрбіна-Башарына.
Нямецкі атракцыён дзеяньне на дроце Фэлікс Нівар.
Атракцыён „сабачы джаз" Бурдан.
Артысты Дзяржопэры Абакумаў (б а с).
Расійскія сюжэты В і н т э р.
Артысты дзяржаўнага акадэмічнага балету Чарбан і Шчадных (клясычны балет).
Музычны фэльетон Александр Монанор.
Жанглёры З Лемешовы
Ціп-Тап акрабаты-эксцэнтрыкі.
Конфэранс—Вольскі, ля рояля Дыдарыкс
Струнны аркестр пад кіраўніцтвам Рыбакова сапра ваджае праграму і грае ў антрактах.
Білеты продаюцца штодзённа ў рабочай касе ад 12 да 2 і ад 4 да 6 вечара, а ў дзень паказу ў касе тэатру ад 6 з палав. гадз. Прымаюцца заявы на цэлевыя спэктаклі. Дзецям да 16 год уваход забараняецца.

АРШАНСКІ МЯСАПРАМЫСЛОВЫ ВУЧЭБНЫ КАМБІНАТ
абвяшчае прыём заяў у мясны тэхнікум на 1-шы курс паўбасна-бляшнага і ўбойна-разьдзелачнага аддзяленьняў. Прымаюцца асобы, скончыўшыя сямігодку.
Да заявы неабходны наступныя дакуманты: даведка аб сац. становішчы, пасьведчаньне аб асьвеце, даведка аб нараджэньні, аб стане здароўя, анкета, засьведчаная адпаведнымі арганізацыямі, дзьве фота-карткі. Прыём заяў праводзіцца да 20 жніўня ў канцылярыі тэхнікуму з 9 гадзін раніцы да 3 гадзін дня штодзённа, акрамя выхадных дзён 2, 7, 12, 17, 22, 27.
Заявы падаваць па адрасе: г. Ворша, Ленінская, 16, мясапрамысловаму вучэбнаму тэхнікуму.
ДЫРЭКЦЫЯ.

КІНО „ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ"
СЁНЬНЯ І ШТОДЗЬНЯ
мастацкі фільм вытворчасьці Арменкіно
АНУШ
пастаноўка І. Н. Пэрэсціані
ЗВЫШ ПРАГРАМЫ
Кіно-хроніка Белдзяржкіно.

„ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА" — Новы замежны фільм ЯЛУЛУ драгадзьня ў 7 част. Звыш прагр. кіно-хроніка Саюзкіно
„ПРАЛЕТАРЫ" — ДЗЕННЫЯ ДЗІЦЯЧЫЯ СЭАНСЫ ШЧАСЬЛІВЫ КЕНТ Пач. у 2 г. дня. Каса—з 12 г. дня. Мастацкі замежны фільм КЛІНОК КЭРСТЭНБРУКА драма ў 8 ч. Пач. у 6 гадз.
„СПАРТАК" Пач.: 7, 8-15, 9-30, 10-45. Каса—з 5 г. Усходні фільм НАМУС драма ў 8 частк.

НАВУКОВЫ ДАСЬЛЕДЧЫ ІНСТЫТУТ ПРАМЫСЛОВАСЬЦІ
—абвяшчае набор —
навуковых асьпірантаў
наступных спэцыяльнасьцей:
1) эканамістаў: а) торфу, б) асноўнай хіміі, в) эканомікі паліва і энэргетыкі,
2) неплатэхнікаў,
3) гідратэхнікаў,
4) кераміка,
5) вяжучых матар'ялаў,
6) гэабатанікаў,
7) мінэралёгаў і крышталёгаў,
8) тэхналёгаў паперы.
Паступаючым у навуковую асьпірантуру НДІП Бел. трэба мець вышэйшую адукацыю (скончыўшыя ВТНУ і ВНУ па адпаведных галінах). Таксама прымаюцца тэхнікі з 3-і гадовым вытворчым стажам адпаведных спэцыяльнасьцей.
Заявы прымае да 15-8-32 г. Сэктар Кадраў—НДІП. Менск, Рэвалюцыйная № 1.
УВАГА: Эканамісты, гэабатанікі, мінэралёгі прымаюцца скончыўшыя ВНУ —эканамічныя, прыродазнаўчыя і фізыка-матэматычныя факультэты.
Усе даведкі можна атрымаць у сэктары кадраў НДІП Бел.
ДЫРЭКЦЫЯ.

ЗАПАЛКАВЫ ТЭХНІКУМ
пры аб'яднаньні ўсесаюзнай запалкавай прамысловасьці абвяшчае асеньні прыём студыяў на 1-ы курс на аддзяленьні:
1) механічнае . . . . . 30 асоб
2) тэхналёгічнае . . . . 30 „
У тэхнікум прымаюцца асобы з адукацыяй не ніжэй сямігодкі, студэнты тэхнікуму забясьпечваюцца стыпэндыяй і інтэрнатам. Апошні тэрмін прыёму заяў 1-га верасьня. Пачатак заняткаў з новым прыёмам 1-га кастрычніка 1932 г. Заявы з неабходнымі дакумэнтамі:
1) аб сацыяльным становішчы,
2) асьвеце,
3) узросьце,
4) здароўі,
5) адносінах да вайсковай павінасьці,
6) засьведчанай анкеты і 2 фота-карткі
накіроўваць на адрасе: БССР, г. Нова-Барысаў, вул. Леніна, запалкавы тэхнікум, дырэкцыі
Дырэкцыя.

БАРЫСАЎСКАЯ лесазаснаёлёатацыйная школа
— абвяшчае —
асеньні набор 245 асоб.
1. На лесасплёатацыйнае аддзяленьне з ведамі 7-годкі — 70 асоб, з ведамі 6-годкі—35, з ведамі 5-годкі—85 асоб.
2. На лесасплаўнае аддзяленьне з ведамі 7-годкі—70 асоб, з ведамі 6-годкі—35 асоб.
Прымаюцца асобы ад 15 год; усе прынятыя забясьпечваюцца стыпэндыяй і інтэрнатам. Тэрмін падачы дакумэнтаў да 15 жніўня. Неабходна прадстаўляць дакуманты: аб асьвеце, аб сац. становішчы, аб стане здароўя, аб узросьце, анкету.
Дырэкцыя.

Рабфак Беларускага Дзяржаўнага Мэдычнага Інстытуту
АБВЯШЧАЕ
асеньні НАБОР студэнтаў
на 1-шы, 2-гі, 3-ці курс вячэрняга аддзяленьня і IV курс дзённага аддзяленьня рабфаку.
Студэнты дзённага рабфаку забясьпечваюцца стыпэндыяй у разьмерах 45 руб. у месяц (як мінімум).
Вячэрняя аддзяленьні прыстасоўваюць вучобу да ўмоў вытворчасьці. На іх праца будзе праводзіцца пазьменна (без адрыву ад вытворчасьці).
Заявы з анкетамі і дакумэнтамі, згодна правіл для паступаючых у ВНУ, прымаюцца да 25 га жніўня ў канцылярыі рабфаку — гор. Менск, Унівэрсытэцкі Гарадок, 1-шы корпус мэдінстытуту, пакой № 107.
Прыём дакумэнтаў і выдача даведак праводзіцца штодзённа ад 12 да 3 гадз. дня і з 6 да 8
Дырэкцыя рабфаку.

РАСЬНЯНСКІ ВЭТЭРЫНАРНЫ ТЭХНІКУМ
абвяшчае чарговы набор студэнтаў на 1-шы курс у ліку 60 асоб.
Жадаючыя паступіць павінны падаць не позьней 25 жніўня заявы на імя прыёмовай камісіі тэхнікуму на адрасе: м. Расна, Магілёўскага раёну, Ветэхнікуму.
Да заявы павінны быць прыкладзены ўсе адпаведныя дакуманты, згодна даведкі ў Наркамасьветы. Прымаюцца асобы з адукацыяй не ніжэй 6-ці груп сямігодкі.
Заняткі пачнуцца з 10 верасьня 1932 г.
Студэнты на 75 проц. ад агульнага ліку забясьпечваюцца стыпэндыяй і інтэрнатам. Пры тэхнікуме ёсьць сталоўка.
Дырэктар тэхнікуму
ІГНАЦЕНКА.

МЕНСКІ АРХІТЭКТУРНА-БУДАЎНІЧЫ с.-г. ТЭХНІКУМ
АБВЯШЧАЕ
прыём студэнтаў на 1-шы курс.
Тэрмін навучаньня 3 гады. Прымаюцца асобы не малодзей 16 год з адукацыяй не ніжэй 7-годкі. Заявы прымаюцца да 15 жніўня. Да заявы павінны быць прыкладзены дакуманты (абавязкова ў арыгіналах): аб узросьце, аб асьвеце, аб сац. становішчы паступаючага і яго бацькоў, аб вытворчым стажы, аб адносінах да вайсковай павінасьці, засьведчаную анкету, дзьве фота-карткі і паштовыя маркі на 30 кап. 65 проц. паступіўшых забясьпечваюцца стыпэндыяй і інтэрнатам. Пачатак заняткаў 1-га кастрычніка. Заявы накіроўваць па адрасе: Менск, Савецкая, 113, Архітэктурна-будаўнічы тэхнікум.
Дырэктар тэхнікуму М. Нікіфрыд.

МАГІЛЕЎСКІ МЭДПАЛІТЭХНІКУМ
абвяшчае асеньні набор студэнтаў на дзенны мэдпалітэхнікум,
ПРЫЁМ ПРАВОДЗІЦЦА НА 1-я КУРСЫ:
акушэрскага аддзяленьня
фармацэўтычнага аддзяленьня
лябарантаў сан.-гігіенічн. лябараторый.
На ўсе тры аддзяленьні прымаюцца без іспытаў асобы, скончыўшыя 7-годкі і роўныя ёй школы, незалежна ад таго, калі яны скончаны.
Узрост ад 15 да 25 год.
Заявы з адпаведнымі дакумэнтамі прымаюцца да 1-га верасьня 1932 г. на адрасе: г. Магілеў, Мэдпалітэхнікум.
Адначасова праводзіцца прыём на вячэрнія акушэрскае і фармацэўтычнае аддзяленьні без адрыву ад вытворчасьці.
Дырэкцыя.

Аб'яднаньню гаспадарчых таварыстваў
БЕЛКААПСАЮЗУ
ПАТРЭБНЫ:
галоўны бухгальтар, бухгальтар-інструктар і юрысконсульт
для пастаяннай работы ў аб'яднаньні,
2 разьвязныя інструктары па лесасплаўдзкай гаспадарцы з пастаянным пражываньнем у Воршы ці Віцебску і 1—у Бабруйску ці Менску. Аплата па згодзе. Зварачацца: Менск, Савецкая, 43/13, пакой № 15, тэл. 6-54, Гаставярн. аб'яднаньне БКС.

БРАГІНСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ ТЭХНІКУМ
буйнай сацыялістычнай мыўёлагадоўлі і малочнай прамысловасьці
абвяшчае асеньні набор студэнтаў
і на падрыхтоўчыя курсы ў тэхнікум.
Прымаюцца ў тэхнікум асобы з адукацыяй у аб'ёме 7-годкі, на курсы—рабочыя прамысловасьці і саўгасаў з адукацыяй 6 груп.
Прынятыя ў тэхнікум забясьпечваюцца інтэрнатам і стыпэндыяй.
Тэхнікум рыхтуе зоатэхнікаў і тэхналёгаў малочнай прамысловасьці.
Да заявы неабходна прыкладзьці дакуманты (у арыгіналах), згодна існуючага палажэньня аб прыёме ў тэхнікумы і ВНУ.
Заняткі ў тэхнікуме пачнуцца з 1-га верасьня, на падрыхтоўчых курсах—з 1-га ліпеня 1932 г.
Дакуманты накіроўваць па адрасе: м. Брагін, БССР, Тэхнікуму.
Дырэктар тэхнікуму ВАПОДЗЬКА.

Тэатру Мюзік-Хол
патрэбен
вялікі дыван (на пракат або ў продаж). З прапановамі зварачацца—сад „Прафінтэрн", дырэктару „Мюзік-Холу" з 6 гадз. вечара.

Прадаюцца тачкі
дрыўляныя і жалезныя.
Адрас: Нямігі, 28, склад Кангасу.

БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ МЭДЫЧНЫ ІНСТЫТУТ
абвяшчае прыём на 2-месячныя падрыхтоўчыя курсы для рабочых і дзяцей рабочых, якія скончылі вячэрнюю школу ўзьвышынага тыпу, і рабочых, якія не закончылі сярэдняй асьветы.
Пачатак заняткаў—10 ліпеня.
Скончыўшыя курсы прымаюцца ў інстытут у асеньні на набор 1932 г. без іспытаў. Да заявы неабходна прыкласьці дакуманты: ад адукацыі, аб сац. становішчы і пакоўкавы, мэтрычную выпіску. Заявы накіроўваць па адрасе: г. Менск, Унівэрсытэцкі Гарадок, канцылярыя мэдінстытуту.
Дырэкцыя.

ПУБЛІКАЦЫІ аб згубе дакумэнтаў у газэце „ЗЬВЯЗДА" НЯ ПРЫМАЮЦЦА.
Просьба грашовых пераводаў для апублікаваньня дакумэнтаў у „ЗЬВЯЗДЗЕ" НЕ ПАСЫЛАЦЬ.

ПА САВЕЦКІМ САЮЗЕ

Выпуск дадатковай прадукцыі ка сотні мільёнаў руб.

Цэнтрасаюз заключае дагаворы з Наркамлёгпрамам аб рэалізацыі спажыўкаапэрацыяй дадатковай прадукцыі на працягу чэрвеня-сьнежня 1932 г.: 42 млн. шклянак, 7 млн. гарэлак, 4 млн. сподкаў і інш. Таксама будзе выпушчана абутку на 65 млн. руб., рэстаўравана старога абутку на 5 млн. руб., выпускаецца ў продаж шарсьцяных вырабаў на 25 млн. руб., баваўняна-папяровых тканін—на 52 млн. руб., гатовай вопраткі—на 103 млн. руб., трыкатажу—на 9 млн. руб., нітак—на 10 млн. руб. і г. д. Наркамлёгпрам СССР памеціў дадаткова пераапрацаваць у трэцім квартале 2,5 млн. тон пражы з вырабам 23 млн. мэтраў баваўняна-папяровай тканіны. Выпачаецца для продажу на 24 млн. руб. спэцвопраткі і спэцабутку. Выпускаюцца на 28,8 млн. руб. мэталічных вырабаў, на 48 млн. руб. гумовых вырабаў і на 10 млн. руб. тэхнатканіны.

Новыя руданосныя плошчы медзі

ТАШКЕНТ, 29. (ТАСС). Да 20 чэрвеня на Малырскіх месцанараджэньнях медзі былі пройдзены сьвідраваль най разьведкай 43 скважыны. Усяго разьведана звыш 300.000 тон медзі. Па трох скважынах ужо гатова да перадачы ў прамысловую эксплёатацыю 47.000 тон медзі. Разьведваўчай партыяй адкрыты новыя руданосныя плошчы ў в. Небэк-Чуку і Верхнім Алмалыку. У Малырскіх рудах знойдзена таксама золата і срэбра.

ЗЬЛЁТ „СТШЭЛЬЦА" У ВІЛЬНІ

Польская буржуазія жыве ідэаламі «вялікай Польшчы». У заветных лятуценьнях пілсудчыкаў малінава-белыя сьцягі з арлом павяваюць і над Смаленскам, і над прадмесьцямі Бэрліну, і над узьбярэжжамі Балтыцкага і Чорнага моря. Апэтыты польскага імпэрыялізму ня маюць граніц...

Але ня толькі лятуценьнямі жывуць уладары сучаснай Польшчы. Уся палітыка польскага фашызму як унутраная, так і замежная, кожны яго крок прадыктаваны іменна тэтым бязьмежным жаданьнем захапіць, заваяваць новыя і новыя абшары.

Асабліва ясна імпэрыялістычная, захватніцкая палітыка польскай буржуазіі праяўляецца ў сыстэме выхаваньня моладзі. У той час, калі пан Залескі заліваецца салаўём з жэнэўскіх трыбун аб польскім «пацыфізьме», выступаючы апосталам «маральнага раззбраеньня», у Польшчы пілсудчына на гвалт фабрыкуе гарматнае мяса.

Праз школу, праз сетку фашысцкіх і сацыял-фашысцкіх моладзьных арганізацый польская буржуазія дзень за днём атручвае частку працоўнай моладзі атрутай зьвярынага нацыяналізму, прычапляючы ёй пераканаьне ў «няўхільнасьці гранічных падзей», (чытай: інтэрвэнцыі), калі трэба будзе на першы заклік камэнданта Пілсудзкага праліць кроў «за вялікую Польшчу ад мора да мора».

Адной з асноўных фашысцкіх моладзьных арганізацый у Польшчы ёсьць «Звёнзк Стшэлецкі» («Стрэлковы саюз»), або коратка «Стшэлец». Ужо самое імя арганізацыі гаворыць аб яе вайсковым характары.

«Стшэлец»—ёсьць буржуазная арганізацыя фашысцкага тыпу, асноўным ядром якое зьяўляецца буржуазная моладзь. Тым ня менш, аднак, цэнтральнай задачай «Стшэльца» ёсьць у першую чаргу ахапленьне і палітычнае выкарыстаньне дробна-мяшчанскай, рабочай і сялянскай моладзі, закаваньне яе ў кайданы фашысцкавайсковай дысцыпліны і процістаўленьне пралетарскаму моладзьнаму руху.

Як арганізацыя вайсковая, праводзячая палітыку польскага імпэрыялізму, «Стшэлец» у аснову сваёй практычнай працы ставіць выхаваньне ахопленай ім моладзі ў духу ваяўнічага нацыяналізму і мілітарызацыю яе.

У апошні час наглядаецца ажыўленьне працы «Звёнзку Стшэлецкага» у Заходняй Беларусі. Гэтае надзвычай сымптаматычнае зьявішча бязумоўна самым цесным чынам зьвязана з ажыцьцяўленьнем інтэрвэнцыяністскіх плянаў польскай буржуазіі і з шпаркім нарастаньнем рэвалюцыйных баёў пад кіраўніцтвам КПЗБ.

Акупанты нават палічылі патрэбным склікаць гэтымі днямі ў Вільні зьезд «Стшэльца» паўночна-ўсходніх ваяводзтваў. У данай абстаноўцы, калі ў Заходняй Беларусі разгортваецца новая паласа нацыянальнага ўціску, калі дамяцца шляхі карных экспэдыцый,—скліканьне зьезду вайсковай арганізацыі ў Вільні мае выразнае палітычнае значэньне, як дэманстрацыя фашысцкіх сіл, гатовых кожную хвіліну быць ужытымі для расправы з рэвалюцыйным рухам.

Не пазбаўлен палітычнай падаплёкі таксама той момант, што на зьезьдзе прысутнічаюць стралецкія дэлегацыі Львова і Верхняй Сілезіі. ВІЛЬНЯ — ЛЬВОЎ—СІЛЕЗІЯ. Гэта пункты, з якіх польскі фашызм думае распачаць сваю «экспансію» на Ўсход і Захад. Вільня—Менск, Львоў—Кіеў, Сілезія—Бэрлін—вось маршруты, якія плянуюцца ў нетрах польскага генэральнага штабу.

Асабліва цікава прыглядзецца да тэй кампаніі, якую разгарнула вілеэнская буржуазная прэса вакол зьезду «Стшэльца». Думкі гэтай прэсы, выказаныя з поваду зьезду, будуць лепшай ілюстрацыяй як дзейнасьці самой арганізацыі, так і палітыкі польскага фашызму.

Напярэдадні зьезду «Кур'ер Віленскі» выступіў з праграмным артыкулам аб задачах «Стшэльца». У артыкуле чытаем:

«Звёнзк Стшэлецкі» выхоўвае салдат: дысцыплінаваных, пёльных, гатовых на кожны заклік падпарадкавацьць свае асабістыя інтэрэсы інтэрэсам Польскай дзяржавы».

Характэрна, што тут-жа «Кур'ер Віленскі» божыцца, б'ючы сябе ў грудзі, што «гэта зусім не палітыка», імкнучыся замаскаваць сапраўдныя мэты «Стшэльца». Праўда, робіць ён гэта надзвычай няўдала, бо яго ўласныя словы зрываюць гэту маску. Папутна «Кур'ер Віленскі» выказвае думку, што салдату паогул палітыкай займацца ня раіцца:

«Ня справа салдата судзіць свае ўлады і не дазволіць сабе на гэта стралец Рэчы Паспалітай. Ён праходзіць салдацкую школу пад кіраўніцтвам знаўцаў справы, вучыцца ўладаць зброяй і слухацца загаду...

...Стрэльцы верна стаяць пры маршале Пілсудзкім, бачачы ў ім правадыра Польскага народу...

...Стрэльцы ведаюць, што калі пад кіраўніцтвам маршала Пілсудзкага ІМ ПРЫДЗЕЦЦА ПРАЛІВАЦЬ КРОЎ, кроў гэта не пралье цца дарма: яна сцэмэнтуе фундаменты Польскай Дзяржавы, не сьветлай будучыні. ТАМУ СТРАЛЬЦЫ ГАТОВЫ Ў КОЖНУЮ ХВІЛІНУ НА ЎСЯКУЮ АХВЯРУ».

Прыстасоўваючы працу «Стшэльца» да заходня-беларускіх умоў, «Кур'ер Віленскі» робіць націск на «грамадзкае выхаваньне». Лейб-орган акупантаў дасканала разумее і адчувае адпорнасьць шырокіх народных мас, асабліва моладзі, адпорнасьць, на якую натыкаецца польскі фашызм пры рэалізацыі сваіх імпэрыялістычных ідэй. «Кур'ер Віленскі» дасканала разумее сілу нацыянальна-вызваленчага руху з КПЗБ на чале. Таму

«пакуль хлапцу з глухой крэсавай вёскі даць у руки вінтоўку, трэба каб гэты хлапец пачуў сябе грамадзянінам Польскай Дзяржавы».

Інакш кажучы, трэба з яго выгуціць антыакупацыйныя настроі, трэба прышчапіць яму пераканаьне «вялікасьці польскага народу»—польскі нацыяналізм.

Але ня так лёгка гэта зрабіць. Ня гледзячы на тое, што арганізацыі «Стшэльца» насаджваюцца адміністрацыйна, часта пры дапамозе тэрору і, як правіла, подкупам і абяцанкай «Стшэлецкіх» прывілей, ня гледзячы на гэта справа «перавыхаваньня крэсавага хлапца» ідзе надзвычай туга.

Пад напорам палітычна-масавай работы камсамолу Заходняй Беларусі ўплывы «Стшэльца» таюць, як сьнег вясной. Працэс раскладаньня зьнізу праходзіць асабліва бурна цяпер у часы глыбокага эканамічнага крызісу.

Імпэрыялістычныя пляны польскай буржуазіі заўсёды сустракалі і будуць сустракаць на акупаваных Заходняй Беларусі і Заходняй Украіне самы рашучы адпор з боку народных мас, КПЗБ і КПЗУ ператвараюць пляцдармы інтэрвэнцыі ў вогнішчы рэвалюцыйных баёў.

В. ТАРСКІ.

Апошнія весткі з фронту індустрыялізацыі

„Бальшавік" перавыканаў паўгадовы плян

ЦК КП(б)Б—т. т. Гікапо і Шаранговічу, Гаркому КП(б)Б—т. т. Кавальчуку і Шпэктараву, Наркамлёгпраму—т. Грысевічу

РАПАРТ

У выніку пасьпяховай барацьбы за рэалізацыю шасьці гістарычных умоў тав. Сталіна і разгортваньне сапраўды сацыялістычных мэтадаў працы, калектыў ударнікаў ЧЫРВОНАСЬЦЯЖНАЙ ГАРБАРНІ «БАЛЬШАВІК» 23 чэрвеня скончыў выкананьне праграмы другога паўгодзьдзя чацьвертага, заваршальнага году пяцігодкі па колькасных паказальніках на 100 проц., у цэнтнасным азначэньні на 104,5 проц.

За пяць месяцаў (студзень-май) прадукцыйнасьць працы ўзьнята на 13,7 проц. Зарплата ўзрасла на 9,2 проц. Мы дабіліся зьніжэньня сабекошту на 8,26 проц. пры плянавым заданьні ў 2,94 проц.

Але на гэтых посьпехах мы ня спыняемся. Запэўняем ЦК КП(б)Б, гарком КП(б)Б і Наркамлёгпрам, што ўвесь калектыў ударнікаў рабоч